ЯГО НАЗЫВАЮЦЬ САМЫМ ВЯДОМЫМ БЕЛАРУСКІМ МАСТАКОМ 9

ЗША-КІТАЙ: ГЛАБАЛЬНАЕ СУПРАЦЬСТАЯННЕ 11

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

17 ЖНІЎНЯ 2019 г. СУБОТА № 155 (29022)

ЛІЧБА ДНЯ

На 7 %

у адносінах да аналагічнага перыяду мінулага года, паводле статыстыкі Белстата, выраслі рэальныя наяўныя грашовыя даходы беларусаў у студзені — чэрвені 2019 года. Найбольшы рост назіраўся ў Мінску — на 8,7 %. На другім месцы Мінская вобласць — 7,9 %. У агульным аб'ёме грашовых даходаў зарплата займае 64 %, даходы ад прадпрымальніцкай і іншай дзейнасці, якая прыносіць даход, — 7,7 %, трансферты насельніцтву — пенсіі, дапамогі, стыпендыі і гэтак далей — 23,7 %, даходы ад уласнасці і іншыя — 4,6 %. Рэальныя наяўныя грашовыя даходы насельніцтва — адзін з галоўных эканамічных паказчыкаў, па якіх вызначаецца дабрабыт грамадзян. Гэта грашовыя даходы за вылікам падаткаў, зборaў і ўзносаў, скарэктаваныя на індэкс спажывецкіх цэн на тавары і паслугі.

КАРАТКА

- Вынікі сацыяльна-эканамічнага развіцця Браслаўскага раёна абмяркоўваліся 16 жніўня на пасяджэнні райвыканкама. У ім прынялі ўдзел кіраўнік Адміністрацыі прэзідэнта Наталля Качанава і намеснік кіраўніка спраў Прэзідэнта Андрэй Стралецкі.
- **Кол-цэнтр па афармленні ДТЗ без выкліку ДАІ з 19 жніўня будзе працаваць кругласутачна па нумары 140.**
- Мастаку-ювеліру Мікалаю Кузьмічу прысвоена званне ганаровага грамадзяніна Брэста.

ISSN 1990 - 763X

ТАКТЫКА, СТРАТЭГІЯ І АДКАЗНАСЦЬ

Фота БелТА.

Прэзідэнт наведаў прадпрыемствы лясной і сельскай гаспадаркі ў Старадарожскім раёне і абазначыў актуальныя задачы ў гэтых галінах

Бягучы тыдзень выдаўся насычаным на рабочыя камандзіроўкі для кіраўніка краіны. У сераду Аляксандр Лукашэнка даваў даручэнні па актывізацыі развіцця паўднёва-ўсходніх рэгіёнаў Магілёўшчыны, а ўчора наведаў Старадарожскі раён Мінскай вобласці. Падчас камандзіроўкі Прэзідэнт азнаёміўся з прадпрыемствамі «Шапчыцы-Агра» ў аднайменным аграгарадку і Старадарожскім доследным лясгасам.

СТАР. 2

Класныя навіны

САКРЭТЫ СТВАРЭННЯ ШКОЛЬНАГА ПАДРУЧНІКА

Якім павінен быць вучэбны дапаможнік у XXI стагоддзі?

73 новыя вучэбныя дапаможнікі з'явяцца ў беларускіх школах у 2019/2020 навучальным годзе, з іх 22 пакуль што знаходзяцца на стадыі выдавецкіх арыгіналаў (макетных узораў). А з 50 выданняў, якія павінны з'явіцца на школьных партах да 1 верасня, 48 ужо надрукаваныя.

Мінулагодняя гісторыя з адсутнасцю папяровага падручніка па геаграфіі ў 8 класе ўвесь навучальны год паўтарыцца не павінна.

— Летась аўтарскаму калектыву не ўдалося падрыхтаваць падручнік па геаграфіі для васьмікласнікаў на належным узроўні, таму быў сфарміраваны новы калектыў, — растлумачыла сітуацыю **намеснік дырэктара па метадычнай рабоце Нацыянальнага інстытута адукацыі Людміла РАМАНОЎСКАЯ.** — А ўвесь патрэбны матэрыял для вывучэння праграмы па гэтай дысцыпліне мы размяшчалі для вучняў і педагогаў на Нацыянальным адукацыйным партале. Хачу заўважыць, што да падручнікаў у нас прад'яўляюцца вельмі жорсткія патрабаванні. Новыя навучальныя дапаможнікі павінны быць маляўніча ілюстраваныя, утрымліваць інфармацыю ў розных формах (дыяграмах, схемах, табліцах), а таксама эфектыўна выконваць навігацыйную функцыю, гэта значыць, утрымліваць знакі і сімвалы, якія адрасуюць вучня і педагога да іншых кампанентаў вучэбна-метадычнага комплексу, у тым ліку і да рэсурсаў, якія знаходзяцца ў інтэрнэце. Сёння новыя падручнікі — гэта сумесны прадукт, вынік партнёрства Нацыянальнага інстытута адукацыі, аўтарскіх калектываў і беларускіх выдавецтваў.

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

СТАР. 4

Спецыяльны рэпартаж

«АБЫ НЕ ПРАПАЛА!»

«Звязда» адправілася на Лунінеччыну, каб высветліць, што і за якія грошы здаюць мясцовыя жыхары нарыхтоўшчыкам, а ў выніку сутыкнулася з цікавай праявай вясковай культуры.

— Чуеце, віном пахне? — кажуць мне, запрашаючы ў змрок і прахалоду складскіх памяшканняў.

На гадзінніку — 7:45, працоўны дзень яшчэ не пачаўся. У паветры сапраўды лунае хмельны водар, але, як толькі вочы прызвычайваюцца да цемры, бачу не скрыні са звонкімі бутэлькамі, а вялізныя кантэйнеры з яблыкамі. Гэта сёлетні апад, які прымаюць у нарыхтоўча-прамысловым камбінаце «Палессе» па 12 капеек за кіло. Ужо заўтра зялёнае добро адправіцца на вінаробчыя заводы Брэстчыны.

Першых здатчыкаў доўга чакаць не прыходзіцца. Яблыкі вязуць на веласіпедах, аўтамабілях і нават нясуць у пакецiках (першы заробак у многіх школьнікаў на канікулах выглядае менавіта так). Цікавасць выклікаюць мужчына з матуляй пенсійнага ўзросту. Яны прывезлі ў багажніку легкавушкі два мяхі яблыкаў, атрымалі за іх 7 рублёў. І тут жа ўзялі камбікорму на 40. Абмен, мякка кажучы, не самы выгадны. Але як не ўзяць, калі проста перад шалямі стаіць дзясятак варыяцый кармоў для свойскай жывёлы — парсючкоў, курэй і трусоў. На любы густ, што называецца.

СТАР. 5

ТАКТЫКА, СТРАТЭГІЯ І АДКАЗНАСЦЬ

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Прэзідэнт даў даручэнне, не чакаючы перамен у надвор'і, паскорыцца з уборкай збожжа, якое засталося на палях, уважліва ставіцца да сельскагаспадарчай тэхнікі і вырашыць на працягу некалькіх найбліжэйшых гадоў праблемы лясной галіны.

Уборка на збожжы не заканчваецца

Асноўныя напрамкі дзейнасці «Шапчыцы-Агра» — вытворчасць малака, мяса, вырошчванне збожжавых культур. Даходы ад рэалізацыі прадукцыі жывёлагадоўлі ў 2018 годзе склалі 4,7 мільёна рублёў, раслінаводства — 301 тысячу рублёў.

Прэзідэнту далажылі аб ходзе ўборачнай кампаніі, асенне-палявых работ, вытворчасці малака ў краіне. Аб ходзе ўборачнай кампаніі дакладваў міністр сельскай гаспадаркі і харчавання Анатоль Хацько. Ён расказаў, што ўжо намалацілі 5 мільёнаў 800 тысяч тон зерня з улікам рапсу і кукурузы. «У нас павінна быць мінімум 7 мільёнаў тон збожжавых», — адказаў на гэта Прэзідэнт, адзначыўшы, што нельга спасылацца на надвор'е.

Нагадаў яшчэ раз кіраўнік дзяржавы і пра стратэгію гэтай уборачнай кампаніі. «Я вас папярэджваў, што галоўнае — стратэгія гэтай уборачнай кампаніі. Мы ўвесь час гаворым: уборка, уборка... І журналісты (яны ж не спецыялісты) падхапілі і раздулі да касмічных памераў. Гэта нават не першы, а другі этап уборкі. Першы — травы. Другі — уборка збожжавых. Яна ўжо перастала быць у нас галоўнай, таму што мы збожжавыя паўраза лі, а астатняе аддалі пад кукурузу, рапс. Збожжавыя ў нас — не галоўнае. Да ўборкі яшчэ вялізныя плошчы бульбы, цукровых буракоў. Вось дзе яшчэ ўборка, яна толькі пачалася», — сказаў кіраўнік дзяржавы.

«Таму я і казаў пра стратэгію, асабліва цяпер. Не чакайце, што ў нас будзе добрае надвор'е. Усё, што засталося, — 10—13 %, а гэта добры хлеб. І гэты хлеб трэба ўзяць», — падкрэсліў беларускі лідар.

Прэзідэнт таксама звярнуў увагу на падрыхтоўку да ўборкі кукурузы: «Сёлета кукуруза добрая, страціць нельга. Мы павінны да 9—9,5 мільёна тон дабіраць за кошт кукурузы. Мы ж нездарма плошчы такія пад кукурузу адвялі. І ў бягучым годзе ў нас няма выйсця з улікам таго, што нам трэба рэзервы папоўніць. У нас ёсць такая магчымасць».

«Сёння неабходна выхапіць, вырваць тое, што яшчэ магчыма ўзяць, і паралельна думаць пра тое, як убраць там, дзе ўжо ў цябе падгон пайшоў і пайшло пустазелле, і травы перараслі», — з веданнем справы заўважыў Аляксандр Лукашэнка. Асаблівую ўвагу кіраўнік краіны звярнуў на неабходнасць аператыўна зжаць авёс і ячмень.

Па словах Анатоля Хацько, яшчэ чакаюць сваёй чаргі на палях грэчка і проса.

«У нас грэчкі і проса хопіць для людзей?» — пацікавіўся кіраўнік краіны.

«Хопіць. У нас яшчэ і рэшткі ёсць па грэчцы, і цэны на грэчку і ў Расіі падаюць», — адказаў міністр. Па яго словах, і ўраджай бульбы будзе добры.

25 жніўня — тэрмін, які даў Прэзідэнт для заканчэння сяўбы азімага рапсу: «Трэба рыхтаваць глебу пад азімыя, каб потым дзень і ноч сеяць, але ў час паспець. Пасееш у час — будзе ўраджай».

Падзеж жывёлы прааналізуюць па ўсёй краіне

Прэзідэнт звярнуў увагу і на праблемы ў жывёлагадоўлі. На думку спецыялістаў, адна з прычын захворванняў жывёлы — кармленне. Правільнае ўтрыманне, добрае, збалансаванае харчаванне — рэцэпт ад усіх хвароб скаціны.

Як паведаміў **памочнік Прэзідэнта Аляксандр КОСІНЕЦ**, летась у Мінскай вобласці загінула 19 600 галоў буйной рагатай жывёлы (з іх 2200 кароў), 102 800 свіней. За першае паўгоддзе 2019-га гібель буйной рагатай жывёлы ў рэгіёне склала 10 400 галоў, свіней — 59 600. «Гэта значыць, рост на 17 % гібелі буйной рагатай жывёлы, на 24 % — свіней. Тут трэба праводзіць вельмі сур'ёзную работу», — адзначыў ён.

«Што будзем рабіць?», — звярнуўся да прысутных Прэзідэнт. Спецыялісты прапанавалі разбірацца з кожным фактам, прасачыць за доглядам, кармленнем.

Губернатар Мінскай вобласці Анатоль ІСАЧАНКА растлумачыў, што лічбы статыстыкі не зусім карэктныя. Невытворчае выбыццё жывёлы дзеліцца на тры кірункі: уласна падзеж, забой і продаж насельніцтву «Вось гэтыя два паказчыкі — забой і продаж насельніцтву — каб схаваць падзеж, заўсёды ідуць уверх. Калі я прыйшоў, гэта спынілі», — паведаміў старшыня Мінскага абласнога выканкама.

Ён нагадаў, што ў гаспадарках Міншчыны па статыстыцы ў 2017 годзе было забіта 25 тысяч галоў жывёлы. «Гэта ж няпраўда. Навошта столькі жывёлы забіваць гаспадаркам? Гэта схаваны падзеж. Мы гэта спынілі, і ў нас нібыта, па статыстыцы, падзеж узрос. На самай справе — не, ён зменшыўся», — растлумачыў губернатар.

Аляксандр Лукашэнка даручыў разабрацца ў гэтай сітуацыі, падключыць генеральнага пракурора і палічыць па выніках года даныя па ўсёй краіне і па абласцях.

«За гэта адкажуць усе. Навошта нам араць зямлю, вырошчваць кармы, — абурыўся Прэзідэнт. — Я нездарма падымаю гэтыя пытанні. Гэта безгаспадарлівасць, гэта проста злачынства. Па гібелі жывёлы разборкі будуць вельмі жорсткія».

Пасля дакладаў кіраўнік краіны наведаў даільна-малочны блок, паглядзеў, у якіх умовах у «Шапчыцах-Агра» ўтрымліваюць жывёлу.

Аляксандр Лукашэнка заклікаў заахвочваць тых, хто працуе ў сельскай гаспадарцы, у тым ліку і на гэтым комплексе. «Нам трэба паглядзець на такія гаспадаркі, якія сёння ўжо не маякі. Маякоў у нас было 60, калі я пачынаў працаваць, з савецкіх часоў. Зараз іх, мабыць, і 1000. І гэтых людзей мы павінны бачыць і падтрымліваць. Таму Адміністрацыі трэба прапрацаваць гэтыя пытанні і прапановы ўнесці», — загадаў ён.

Багацце, атрыманае ад прыроды

У Старадарожскім доследным лясгасе кіраўніку краіны паведамілі аб сацыяльна-эканамічным развіцці Мінскай вобласці і Старадарожскага раёна.

Павольна ідзе развіццё гарадоў-спадарожнікаў сталіцы. Адна з прапаноў для яго ажыўлення — з'яўленне бізнесу ўсіх узроўняў, які будзе забяспечваць рабочымі месцамі жыхароў. Міншчыне трэба задумацца і аб дыверсіфікацыі прамысловасці.

Старадарожскі раён ганарыцца адным з самых нізкіх узроўняў беспрацоўя ў вобласці і хуткім вырашэннем праблемы забяспечанасці шматдзетных сем'яў жыллём.

Заслухаў Прэзідэнт і даклад аб рабоце лясной гаспадаркі прафільнага міністра Віталя Дрожжы. Кіраўнік ведамства заўважыў, што ў краіне недастаткова развіта перапрацоўка нізкаякаснай дзелавой драўніны. Сёлета кіраўнік дзяржавы для вырашэння пытання дазволіў 800 000 кубаметраў такой драўніны рэалізаваць на экспарт. Міністр расказаў, што для вырашэння задачы рэалізуецца праграма па будаўніцтве шасці пелетных заводаў.

«Яны вырашаюць праблему выкарыстання нізкаякаснай драўніны. З уводам гэтых шасці прадпрыемстваў ужо ў 2021 годзе мы прыцягнем у абарот дадаткова яшчэ 500 000 кубаметраў нізкаякаснай драўніны, — паведаміў Віталь Дрожжа. — У першым паўгоддзі наступнага года ўсе ўжо будуць працаваць. Мы ставім задачу да канца года атрымаць першыя пелеты з некаторых заводаў».

Па выніках наведвання лясгаса Аляксандр Лукашэнка даручыў распрацаваць у краіне праграму па ўключэнні ў абарот нізкаякаснай дзелавой драўніны. Усе праблемы лесу павінны быць вырашаны за пяць гадоў.

«Толькі гэты, будучы год, яшчэ 2021-ы. Усё! Мы ўбачым патрэбы на ўзроўні краіны. І вы павінны спланаваць, каб на канец 2022 года ўсё перапрацоўвалі. Гэта галоўнае пытанне. І мы павінны на наступную пяцігодку спланаваць такім чынам, каб перапрацоўвалі ўсё, каб не было буралому», — падкрэсліў Прэзідэнт.

Па словах кіраўніка краіны, да лесу трэба падысці па-гаспадарску, бо гэта багацце, дадзенае Богам. «Што не атрымліваецца ацаліндраваць — трэба ў пелеты і прадаць», — падкрэсліў Прэзідэнт.

Аляксандр Лукашэнка азнаёміўся з прадукцыяй прадпрыемства. Сярод іншага, акрамя прадукцыі дрэваапрацоўкі, тут вырошчваюць туі, елкі і іншыя расліны для азелянення гарадоў, а таксама ягады і грыбы, здабываюць бярозавік і лясны мёд, якія пакаштаваў Прэзідэнт.

Марыя ДАДАЛКА,
Старадарожскі раён.

Каментарый у тэму

Міністр сельскай гаспадаркі і харчавання Анатоль ХАЦЬКО: «Засталося да завяршэння ўборкі каля 320 000 гектараў. Мы разлічваем з улікам спецыфікі кліматычных умоў завяршыць уборку па апошнім, Віцебскім, рэгіёне ў тэрмін да васьмі дзён. Мы вядзём цэлы комплекс работ. Ідзе падрыхтоўка да асенняй сяўбы, прыступілі да сяўбы рапсу. Ужо каля 15 працэнтаў рапсу пасеяна. Чакаецца вялікая кампанія ў цэлым па правядзенні асенняй сяўбы — каля двух мільёнаў гектараў мы павінны засеяць сёлета. Ідзе ўборка саломы, цярабленне лёну».

Міністр лясной гаспадаркі Віталь ДРОЖЖА: «У нас сёння ёсць пэўныя пытанні ў частцы перапрацоўкі і выкарыстання нізкаякаснай дзелавой драўніны. І Прэзідэнт даручыў у найбліжэйшы час распрацаваць праграму з рэалізацыяй яе максімум за тры гады і ўцягнуць у перапрацоўку, выкарыстанне ўвесь рэсурс драўніны, які мы маем сёння ў краіне. Справа ў тым, што з развіццём у Еўропе той жа біяэнергетыкі больш звярнуліся да біяпаліва, выкарыстання аднаўляльных крыніц. Цяпер гэта становіцца актуальным, мы разумеем, што гэта прыбыткова і выгадна. Чаму б гэтым не займацца?»

ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

Трамп мяркуе купіць Грэнландыю

Прэзідэнт ЗША Дональд Трамп хоча купіць Грэнландыю — найбуйнейшы ў свеце востраў, які належыць Даніі. Пра гэта паведаміла газета Wall Street Journal са спасылкай на інфармаваныя крыніцы ў Белым доме. Як піша выданне, прэзідэнт неаднаразова пытаўся ў сваіх дарадцаў, ці можа ЗША набыць Грэнландыю, і з цікавасцю слухаў абмеркаванне рэсурсаў вострава, які геапалітычнага значэння, у тым ліку магчымасці пашырэння амерыканскай ваеннай прысутнасці ў Арктыцы. Адзначаецца, што ён нават папрасіў юрысконсульта Белага дома правесці прававую экспертызу праекта. Некаторыя з дарадцаў Трампа падтрымалі план, назваўшы яго эканамічна мэтазгодным, у той час як іншыя мяркуюць, што гаворка ідзе аб «мімалётным захапленні» прэзідэнта, якое ніколі не рэалізуецца. У маі Грэнландыю павінен быў наведаць дзяржсакратар ЗША Майк Пампеа, аднак паездка адмянілася з-за сітуацыі ў Іране. Выданне нагадвае, што гэта не першая спроба Вашынгтона купіць Грэнландыю. Пасля Другой сусветнай вайны прэзідэнт Гары Трумэн прапаноўваў Даніі за яе сто мільёнаў долараў, але атрымаў адмову. Дзярждэпартамент вывучаў магчымасць набыць востраў яшчэ ў 1867 годзе. Між тым Данія ўжо прадавала свае тэрыторыі Амерыцы. На рэферэндуме 1917 года датчане прагаласавалі за продаж Дацкай Вест-Індыі — так называліся калоніі на частцы Антыльскіх астравоў у Карыбскім моры. Набытая за 25 мільёнаў долараў тэрыторыя была перайменавана ў Амерыканскія Віргінскія астравы.

Улады Ганконга абвясцілі аб мерах эканамічнай падтрымкі насельніцтва на $2,5 млрд

Урад Ганконга ініцыяваў пакет мер па стымуляванні эканомікі і сацыяльнай падтрымцы насельніцтва на агульную суму 19,1 млрд ганконгскіх долараў (амаль $2,5 млрд). Такую заяву зрабіў сакратар па фінансавых пытаннях (міністр фінансаў) гэтага адмысловага адміністрацыйнага раёна КНР Пол Чан. Ён заклікаў не ўвязваць згаданую праграму з цяперашнім вострым унутрыпалітычным крызісам і пратэстамі насельніцтва. Новаўвядзенне, паводле яго слоў, звязана з перспектывай запаволення тэмпаў эканамічнага росту Ганконга. Міністр паведаміў, што ў трэцім квартале 2019 года можа азначыцца рэцэсія, а па выніках года прагноз росту мясцовага ВУП паніжаны з 2—3 % да ўзроўню 0—1 %. Чан падкрэсліў, што сітуацыя абяцае быць найгоршай з 2009 года, калі ў разгары быў глабальны фінансавы крызіс. На гэтым фоне прынята рашэнне аб маштабных мерах падтрымкі насельніцтва. Гаворка ідзе пра зніжэнне падатковага цяжару, выплаце субсідый для школьнікаў у памеры 2,5 тысячы ганконгскіх долараў кожнаму ($319), субсідый на электрычнасць кожнай сям'і на дзве тысячы ганконгскіх долараў ($255), падтрымцы маламаёмных, пенсіянераў, прадстаўнікоў малога і сярэдняга бізнесу, шэрагу галін эканомікі.

Расія назвала ўмову перадачы Курылаў Японіі



Міністр замежных спраў Расіі Сяргей Лаўроў заявіў, што перадача двух Курыльскіх астравоў Японіі магчымая толькі пасля прызнання вынікаў Другой сусветнай вайны і заключэння мірнага дагавора. Кіраўнік МЗС нагадаў, што РФ з'яўляецца юрыдычным прадаўжальнікам Савецкага Саюза і таму прызнае Дэкларацыю 1956 года, згодна з якой краіна гатовая перадаць два востравы толькі пасля заключэння мірнага дагавора. «Пакуль усё ўпіраецца ў нежаданне нашых японскіх калег прызнаць вынікі Другой сусветнай вайны, тым самым перашкаджаючы падпісанню мірнага дагавора. Я не думаю, што сітуацыя тупіковая», — сказаў Лаўроў. Раней афіцыйны прадстаўнік Міністэрства замежных спраў Расіі Марыя Захарава пракаментавала карту, размешчаную на сайце Алімпійскіх гульняў — 2020 у Токіа, дзе Курылы ўключаны ў склад Японіі. На думку Захаравай, такія дзеянні непраўвамерныя і не ідуць на карысць адносінам дзвюх краін. Мірны дагавор паміж Расіяй і Японіяй не падпісаецца больш за 70 гадоў. Умовай яго заключэння Токіа называе вяртанне астравоў Ітуруп, Кунашыр, Шыкатан і Хабамаі. Масква лічыць, што паўднёвыя Курылы ўвайшлі ў склад СССР па выніках Другой сусветнай вайны, і суверэнітэт над імі не падлягае сумненню.

З нагоды

«ЗУБРАНЯЦІ — 50!»

Учора ў славутым дзіцячым лагеры пачаліся ўрачыстыя мерапрыемствы

Героі свята — тыя, хто адпачывае ў «Зубраняці» на пятай змене юбілейнага лета. Віцэ-прэм'ер Ігар Петрышэнка адзначыў, што ў гэтым цэнтры пануе асаблівы «зубраняцкі дух», які натхняе ўсіх на эфектыўную работу. Атмасфера шчырая і пазітыўная, яна прываблівае дзяцей як з Беларусі, так і з замежжа.

Фота БелТА.

Ігар ПЕТРЫШЭНКА адкрывае скульптурную кампазіцыю.

Дзіцячы адукацыйна-аздараўленчы цэнтр на базе піянерскага лагера быў створаны па рашэнні Прэзідэнта Аляксандра Лукашэнкі для таго, каб у ім развіваліся вядучыя методыкі навучання і аздараўлення дзяцей. «І наша галоўная задача — не спыняць яго ўдасканаленне. У «Зубраняці» пастаянна ўдасканальваюцца інфраструктура і ўмовы пражывання. Усё створана для таго, каб дзеці змаглі адпачыць, аздаравіцца і з новымі сіламі далей асвойваць вучэбную праграму», — дадае віцэ-прэм'ер.

У гэты дзень Ігар Петрышэнка ад імя кіраўніка дзяржавы выканаў асаблівую місію — уручыў калектыву цэнтра Ганаровы дзяржаўны сцяг Рэспублікі Беларусь за асаблівыя дасягненні ў сацыяльна-культурным развіцці, арганізацыі навучання, выхаванні і аздараўленні дзяцей. Два работнікі цэнтра былі ўдастоены Ганаровых грамат Савета Міністраў, яшчэ чатыры — нагрудных знакаў Міністэрства адукацыі. Іх яны атрымалі ад міністра Ігара Карпенкі.

У мерапрыемствах, прысвечаных юбілею аздараўленчага цэнтра, прымалі ўдзел хлопчыкі і дзяўчынкі, якія там адпачываюць, а таксама ганаровыя госці. Для ўсіх удзельнікаў свята сёння будзе прадстаўлена скульптурная кампазіцыя «Наш важаты — таварыш і сябар», акрамя гэтага, госці змогуць папрысутнічаць на прэзентацыі кнігі «Краіна дзяцінства, радасці, мар», наведаць экскурсію па сучаснаму «Зубраняці», адпачыць на важацкім вечары «Юнацтва — праз гады, праз адлегласці» і многае іншае.

Парадуюць усіх і міжнародны фестываль гульнявых праграм, сумесныя забавы з выхаванцамі і супрацоўнікамі «Зубраняці» розных пакаленняў падчас юбілейнага вогнішча «У зубраняцкім коле», святочная дыскатэка, а таксама шоу-праграма «Нам 50!», дзе выступяць зоркі беларускай эстрады. Завершыцца свята феерверкам і лазернымі прадстаўленнямі.

З юбілеем «Зубраня» павіншаваў Прэзідэнт Аляксандр Лукашэнка. «За паўстагоддзя гэты гасцінны і маляўнічы маленькі куток Беларусі на беразе Нарачы ператварыўся ў дзіўны астравок шчаслівага дзяцінства і моцнай дружбы. Сюды з задавальненнем прыязджаюць ініцыятыўныя і таленавітыя хлопчыкі і дзяўчынкі з нашай краіны і замежжа. Акрамя таго, «Зубраня» — сімвал дзіцячай дыпламатыі. Тут пабывалі юныя грамадзяне больш чым з 45 дзяржаў, і кожная міжнародная змена — новы крок насустрач агульнай будучыні, міру і бяспецы», — гаворыцца ў віншаванні.

Паводле БелТА.

Экалагічная экспедыцыя на АЭС

пачала работу па замеры «нулявога фону» на тэрыторыі, якая прылягае да пляцоўкі будаўніцтва беларускай АЭС. Палявы этап даследаванняў працягнецца да 20 жніўня і дазволіць высветліць стан экалагічнай, радыяцыйнай і ядзернай бяспекі ў раёне ўзвядзення станцыі.

Мяркуецца правесці гама-спектраметрычную здымку, адабраць пробы паветра, вады, глебы, донных адкладанняў і раслінасці. Будзе вызначана актыўнасць радыенуклідаў у вызначаных пробах і падрыхтавана справаздача аб выніках работы.

Па выніку вывучэння будзе атрымана незалежная экспертная ацэнка зыходных умоў навакольнага асяроддзя ў раёне будаўніцтва станцыі, якую прадставяць беларускаму грамадству і ў сумежныя краіны.

Праверка праводзіцца па ініцыятыве АЭС з выкарыстаннем вопыту правядзення аналагічных мерапрыемстваў расійскай арганізацыі «Канцэрн Расэнергаатам» і Фонду «Асацыяцыя тэрыторый размяшчэння атамных электрастанцый».

У складзе даследчыкаў — прадстаўнікі міжнароднай экалагічнай грамадскай арганізацыі «Зялёны крыж», агенцтва экалагічнай бяспекі «Альфа-Х91», навукова-асветніцкая арганізацыя «Энергія і Экалогія» ды шэраг іншых устаноў.

Ірына СІДАРОК.

Футбол

НАЙЛЕПШЫЯ ГУЛЬНІ ЯШЧЭ НАПЕРАДЗЕ

Футбалісты БАТЭ прабіліся ў плэй-оф кваліфікацыі Лігі Еўропы, перамогшы па суме дзвюх сустрэч чэмпіёна Босніі і Герцагавіны «Сараева»

Нагадаем, у першым матчы тыдзень таму барысаўчане выйгралі з лікам 2:1 у гасцях, а на сваёй арэне згулялі ўнічыю 0:0.

— Найлепшыя гульні яшчэ наперадзе, — адзначыў **галоўны трэнер БАТЭ Аляксей БАГА.** *— У еўракубках любы рыкашэт, любая секунда могуць перавярнуць гульню. У нас быў добры вынік у Босніі. Ён даў нам псіхалагічную перавагу, але мы павінны былі разумець, супраць каго гуляем: сапернік рызыкаваў да канца.*

У барацьбе за выхад у групавы этап Лігі Еўропы БАТЭ згуляе з казахстанскай «Астаной». Адзначым, што з 2008 года барысаўчане толькі двойчы не выходзілі ў групавы этап еўракубкаў і кожны раз на іх шляху ўставалі каманды з Казахстана.

— Кожны новы год, кожная еўракампанія — новы выклік, новы іспыт. Склалася дрэнная традыцыя, але стаўлюся да гэтага спакойна. Будзем рыхтавацца да «Астаны» так, як да каманды з любой краіны, — адзначыў галоўны трэнер БАТЭ.

У сваю чаргу, **галоўны трэнер футбольнага клуба «Астана» Раман ГРЫГАРЧУК** адзначыў, што БАТЭ — гэта ўжо брэнд у футболе, каманда шмат чаго дамаглася на еўрапейскай арэне. *«У іх вельмі добра падабраны склад, вельмі дасведчаны трэнер. Так што нас чакаюць вельмі сур'ёзныя матчы, і мы павінны быць найлепшым чынам гатовыя да гэтага супрацьстаяння».*

Салігорскі «Шахцёр» пасля буйнога гасцявога паражэння ад італьянскага «Торына» 0:5 на полі мінскага стадыёна «Дынама» згуляў унічыю — 1:1 — і выбыў з розыгрышу Лігі Еўропы.

Матчы за выхад у групавы этап Лігі Еўропы адбудуцца 22 і 29 жніўня.

Дар'я ЛАБАЖЭВІЧ.

ЮБІЛЕЙ СТАЛІЧНАЙ МІЛІЦЫІ

Заўтра ГУУС Мінгарвыканкама святкуе 75-годдзе з даты ўтварэння. Урачыстае мерапрыемства ў гонар гэтай даты прайшло на плошчы Дзяржаўнага сцяга.

Павіншаваць іх прыбыў **міністр унутраных спраў Юрый КАРАЕЎ.**

— У сталічнай міліцыі служаць годныя, адукаваныя і вельмі падрыхтаваныя людзі, — зазначыў кіраўнік ведамства. — Я не ведаю службы цяжэйшай, чым служба міліцыянера — асабліва ўчастковага, аператыўніка. Яны кожны дзень сустракаюцца больш з дрэнным, чым з добрым. Таму ім важна і прафесійна не выгарэць, і быць заўсёды добрымі да людзей, памятаць, што яны абараняюць добрапрыстойную большасць насельніцтва ад меншасці, якая наўмысна парушае законы.

75 гадоў таму, у толькі вызваленым ад немцаў Мінску, ва Упраўленне міліцыі сталіцы тагачаснай БССР увайшоў асобны дывізіён міліцыі НКУС, гарадскія аддзяленні праваахоўнікаў і дывізіён рэгулявання вулічнага руху.

— У той момант была патрэбна арганізацыя сіл, якія маглі змагацца са злачыннасцю, — падкрэсліў **начальнік ГУУС Мінгарвыканкама Іван КУБРАКОЎ.** — Фарміравалася мінская міліцыя ў тыя гады выключна з баявых салдат, сяржантаў і афіцэраў. Гэта былі былыя франтавікі і партызаны. Практычна кожную ноч на тэрыторыі Мінска фіксавалася некалькі забойстваў, рабяжоў, разбояў... Супрацоўнікі міліцыі, якія толькі знялі ваенны мундзір, зноў выйшлі на барацьбу, гэтым разам ужо супраць бандытызму. І традыцыі, якія былі закладзены ў тыя часы, мы працягваем і сёння.

Валяр'ян ШКЛЕННІК.

ФАКТЫ ПАДЗЕІ НАВІНЫ ФАКТЫ ПАДЗЕІ НАВІНЫ

Пасевы «гарэлі», цяпер «тонуць»

Пераўвільгатненне глебы ўскладняе правядзенне ўборачных работ. Яно назіраецца на значнай частцы тэрыторыі краіны, інфармуе Рэспубліканскі цэнтр па гідраметэаралогіі, кантролі радыеактыўнага забруджвання і маніторынгу навакольнага асяроддзя Мінпрыроды.

Найбольш неспрыяльная аграметэаралагічная абстаноўка для палявых работ складваецца ў паўночным рэгіёне краіны, дзе пераважаюць цяжкія па механічным саставе глебы. На пераўвільготненых участках уборка ўраджаю, апрацоўка глебы пад пасеў азімых і сяўба крыжакветных культур, церабленне лёну, нарыхтоўка кармоў абцяжараныя. Разам з тым дажджы, якія прайшлі, папоўнілі ўтрыманне вільгаці ў глебе ў паўднёва-заходняй частцы краіны, дзе пад караняплодамі і позняй гародніной адзначаўся яе недахоп.

У найбліжэйшы час чаканае паляпшэнне ўмоў надвор'я дазволіць аднавіць правядзенне ўборачных работ, паведамляюць сіноптыкі. Аграметэаралагічныя ўмовы, у першую чаргу для завяршэння ўборкі збожжа, на большай частцы тэрыторыі краіны палепшацца. Аднак на цяжкіх глебах у выніку пераўвільгатнення работа тэхнікі паранейшаму будзе ўскладнена. Па меры павышэння тэмпературнага рэжыму аграметэаралагічная абстаноўка будзе спрыяць фарміраванню ўраджаю зерня кукурузы, назапашванню цукру ў цукровых бураках.

Участковы абясшкодзіў лісу

Каля 11 гадзін у Слуцкі РАУС звярнулася гараджанка. Яна паведаміла, што ў двары дома маці, што жыве ў вёсцы Шышчыцы, знаходзіцца ліса, меркавана — хворая на шаленства.

Як паведамілі ў УУС Мінаблвыканкама, жанчына зайшла ў хлеў, каб узяць сельскагаспадарчы інструмент, і ўбачыла жывёлу. Ліса кінулася на яе, маці заяўніцы выбегла на двор і схавалася ў хаце. Праз акно случанка назірала, як ліса кідаецца з боку ў бок, шыпіць, скуголіць.

Інфармацыя пра здарэнне была перададзена ўчастковаму. Той знаходзіўся на адміністрацыйным участку за 15 хвілін язды ад вёскі. Супрацоўнік міліцыі адразу ж звязаўся з мясцовымі паляўнічымі і папрасіў іх паназіраць за жывёлай, каб яна не ўцякла, а заадно не падпускаць да двара, дзе знаходзіцца ліса, нікога старонняга.

Неўзабаве міліцыянер прыбыў на месца, на падыходзе да двара заўважыў жывёлу. Ліса таксама заўважыла чалавека і, ашчэрыўшыся і заскуголіўшы, стала паводзіць сябе агрэсіўна і кідацца ў бок супрацоўніка міліцыі.

Пераканаўшыся, што паблізу няма людзей, участковы інспектар выкарыстаў табельную зброю — адным стрэлам абясшкодзіў жывёлу.

Цяпер на месцы чакаюцца прадстаўнікі ветэрынарнай службы, якія павінны забраць лісу для правядзення адпаведнай экспертызы. Паводле папярэдняй інфармацыі, жывёла не паспела нікому прычыніць шкоды.

У «алкагаражы» выявілі каля 1200 літраў спірту

Кобрынская міліцыя падчас агляду гаражоў выявіла ў беспрацоўнага мясцовага жыхара каля 1200 літраў спіртазмяшчальнай вадкасці.

— Жыхар раённага цэнтра займаўся незаконнай прадпрымальніцкай дзейнасцю, звязанай з пастаўкай спіртазмяшчальнай вадкасці з-за мяжы і рэалізацыяй яе жыхарам раёна. Падчас аператыўна-вышуковых мерапрыемстваў выяўлена 114 пластыкавых каністраў ёмістасцю па 10 літраў кожная, 10 каністраў па 5 літраў са спіртазмяшчальнай вадкасцю агульным аб'ёмам 1195 літраў, — паведаміла **старшы оперупаўнаважаны па асабліва важных справах галоўнага ўпраўлення па барацьбе з эканамічнымі злачынствамі Міністэрства ўнутраных спраў Вераніка ПАСМЕЦЬЕВА.**

Таксама ў гаражы былі выяўлены прадметы, прызначаныя для разліву і развядзення спірту з мэтай далейшага перапродажу.

Акрамя таго, у засеках мужчына захоўваў 10 бутэлек гарэлкі Kurant па 0,5 літра кожная без беларускіх акцызных марак. Алкагольны асартымент праваахоўнікі ацанілі ў 21 тысячу рублёў. Мужчына растлумачыў, што алкаголь купіў у Расіі для асабістага выкарыстання.

Прадукцыя канфіскавана, а ў дачыненні да правапарушальніка складзены адміністрацыйны пратакол.

Сяргей РАСОЛЬКА.

Пласты гісторыі

АРХЕАЛОГІЯ — НАВУКА СТАРАЖЫТНЫХ АРТЭФАКТАЎ

Сёлета з пачатку года ў Інстытуце гісторыі НАН выйшлі дзве грунтоўныя працы. Адна з іх — «Гісторыя беларускай дзяржаўнасці», першая палова якой прысвечана раскрыццю вытокаў і асаблівасцяў развіцця беларускай дзяржаўнасці ад старажытнасці да канца XVIII стагоддзя. Прадстаўленыя звесткі абапіраюцца на археалагічны матэрыял, дзякуючы якому можна па-новаму паглядзець на тое, як жылі нашыя продкі. Другая праца мае назву «Славяне на тэрыторыі Беларусі ў дагістарычны перыяд». Гэта другое выданне, першае ўбачыла свет тры гады таму. У працы прадстаўлены новыя помнікі археалогіі, звязаныя з перыядам жыцця ранніх славян на тэрыторыі Падзвіння з IV стагоддзя, апавядаецца пра славянскія паселішчы канца IV—V стагоддзя і VI — пачатку VII стагоддзя. Асаблівая ўвага аддаецца археалагічнаму помніку таго часу, які знаходзіцца побач з вёскай Кардон Шумілінскага раёна.

Каштоўныя артэфакты па ўсёй тэрыторыі краіны навукоўцы знаходзяць штогод, перыядычна імі выяўляюцца і новыя факты пра мінулае. Пра гэта нагадала **загадчыца цэнтра археалогіі і старажытнай гісторыі Беларусі Інстытута гісторыі НАН Вольга ЛЯЎКО.** Яна адзначыла, што цяпер адбываецца гістарычная рэвалюцыя. Напрыклад, доўгі час лічылася, што славяне пачалі актыўна засяляць тэрыторыю Беларусі ў IX стагоддзі і асноўную частку пасяленцаў складалі балты.

— Сёння мы з упэўненасцю можам гаварыць, што гэта не так. Пачынаючы з IV—V стагоддзяў славяне фарміравалі сваю абшчыну, а ў эпоху вялікага перасялення народаў, якое адбылося ў IV—VII стагоддзях, вызначылася аснова ўсходняга славянства. Незвычайным артэфактам гэтага года можна назваць шлем з тысячагадовай гісторыяй (канец X стагоддзя), знойдзены пад Бабруйскам. Належаў ён, хутчэй за ўсё, полацкаму князю Ізяславу.

Навуковец адзначыла, што частка ад археалагічных раскопак чакаюць сенсацыі, але не ўсё тое, што з'яўляецца «адкрыццём года», знаходзіць свой працяг у гісторыі.

— Археалогія — гэта жывая рэч, якая назапашвае ў сабе не толькі значныя для гісторыі рэчы, бываюць знаходкі, якія не ўяўляюць ніякай каштоўнасці для нас, але каб праверыць гэта, патрабуецца шмат часу. Прывяду прыклад. Некалі да нас у інстытут прывезлі нешта падобнае на старажытнага ідала. Мы яго вывучалі на працягу года, пакуль рыхтаваліся вынікі даследаванняў з Беларусі, Польшчы, Расіі і Германіі. Аказалася, што гэта аб'ект 1996 года, а значыць, не ўяўляе цікавасці для навукоўцаў.

Намеснік дырэктара па навуковай рабоце Інстытута гісторыі НАН Вадзім ЛАКІЗА абазначыў асноўныя кірункі для работы беларускіх археолагаў на найбліжэйшы час:

— Выдача дазволаў на права правядзення археалагічных даследаванняў — важны момант для развіцця айчыннай археалогіі. На цяперашні момант Інстытуту гісторыі НАН выдадзена 154 дазволы на ўсю тэрыторыю Беларусі, на імя даследчыкаў Інстытута гісторыі і ВНУ нашай краіны — 54. Гэта вялікая колькасць, таму што летась іх было 174. Актыўна развіваецца падводная археалогія, пра гэта сведчаць абарончыя збудаванні, знойдзеныя каля Жаберскага замка ў Драгічынскім раёне. Каля 70-75 працэнтаў дазволаў ідзе на выратавальную археалогію, а новым кірункам сталі раскопкі на месцах ваенных падзей. З найбліжэйшых экспедыцый на Бярэзіну, яна адбудзецца ў верасні — пачатку кастрычніка і будзе праводзіцца беларускімі, французскімі і бельгійскімі археолагамі.

Супрацоўнік НАН расказаў, што сёлета ўжо былі праведзены дзясяткі розных экспедыцый. Зараз, напрыклад, адбываецца маштабнае даследаванне ў гарадзішчы Копын Любанскага раёна, дзе быў знойдзены ўнікальны артэфакт — сякера першай паловы першага тысячагоддзя. Такая знаходка чацвёртая на тэрыторыі Беларусі.

— Падобныя гістарычныя аб'екты заўсёды знаходзяць сваё месца ў якасці матэрыялаў для навукоўцаў. Мы даследуем археалагічныя помнікі, пачынаючы з эпохі палеаліту. Не так даўно праводзіліся работы ў Навасёлках Веткаўскага раёна, дзе былі знойдзены цікавыя для гісторыі артэфакты. Перыядычна працуем у Белавежскай пушчы. Грунтавыя могільнікі X-XI стагоддзяў, баявыя бранзалеты, жалезныя сякеры былі знойдзены ў Ашмянскім раёне, — расказвае навуковец.

Тое, што лета — самая спрыяльная пара для археалагічных раскопак, адзначыў **загадчык аддзела археалогіі першабытнага грамадства Інстытута гісторыі НАН Беларусі Станіслаў ЮРЭЦКІ**:

— Таму мы актыўна супрацоўнічаем з летнімі лагерамі, школьнікамі і студэнтамі, а таксама валанцёрамі. Прыемна, што пасля многіх экспедыцый некаторыя з іх хочуць звязаць сваю будучыню з археалогіяй. Іншым часам для вялікіх выездаў не хапае рабочых рук, таму заўсёды рады дапамозе ахвотных.

Дар'я ШЛАПАКОВА.

САКРЭТЫ СТВАРЭННЯ ШКОЛЬНАГА ПАДРУЧНІКА

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Большасць новых вучэбных дапаможнікаў трапяць сёлета да вучняў дзявятых класаў, паколькі вось ужо некалькі гадоў ва ўстановах адукацыі паэтапна ўкараняюцца новыя навучальныя праграмы: першымі на абноўлены змест навучання перайшлі ў 2015/2016 навучальным годзе першыя і пятыя класы, на наступны год — другія і шостыя, далей — трэція і сёмыя, чацвёртыя і восьмыя класы, а зараз надышла чарга дзевяцікласнікаў.

> Новыя падручнікі і навучальныя дапаможнікі ўключаюць больш практыка-арыентаваных заданняў. Навучальны матэрыял у іх аптымізаваны з пункту гледжання даступнасці для навучэнцаў з улікам узроставых асаблівасцяў школьнікаў, абапіраецца на нацыянальны кантэкст...

ЧЫТАЦЬ... РУКАМІ

Выдавецтва «Народная асвета» выпускае да новага навучальнага года 19 найменняў падручнікаў агульным тыражом каля 1 мільёна экзэмпляраў.

— Мы выдалі падручнікі для 5-га класа «Гісторыя Старажытнага свету» на рускай і беларускай мовах, «Працоўнае навучанне. Тэхнічная праца» для 7—9-х класаў, «Фізіка», «Алгебра», «Геаметрыя», «Хімія», «Біялогія», «Інфарматыка» для 9 класа таксама на дзвюх мовах, — расказала **дырэктар выдавецтва Вікторыя КАЛІСТРАТАВА.** — Акрамя таго, забяспечваем вучэбнай літаратурай і дзяцей з асаблівымі патрэбамі (невідушчых, з асаблівасцямі інтэлектуальнага развіцця).

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Для дзяцей з парушэннем зроку рыхтуюцца падручнікі, выкананыя рэльефна-кропкавым шрыфтам Брайля. Для перадачы тэксту ў ім выкарыстоўваюцца камбінацыі з шасці кропак. Шрыфт наносіцца з адваротнага боку ліста і «чытаецца» рукамі па выпукласцях (тактыльнае чытанне). Брайлеўскія падручнікі цалкам адпавядаюць выданням для агульнаадукацыйнай школы, але калі звычайны падручнік змяшчаецца пад адной вокладкай, то тут, напрыклад, падручнік па геаграфіі для 11 класа займае 12 (!) тамоў. Затое ў ім ёсць і карты, і выявы, выкананыя на полістыроле кропкавым метадам, якія дзеці таксама могуць цяпер «счытваць» пальцамі. Полістырол лічыцца больш даўгавечным матэрыялам, чым папера.

Сёлета выдавецтва падрыхтавала «Буквар» для невідушчых дзяцей — першую настольную кнігу для школьніка. Ён будзе займаць 13 тамоў.

ПРАВЕРКА НА ТРЫВАЛАСЦЬ

— Пры распрацоўцы навучальных дапаможнікаў мы актыўна задзейнічаем інфармацыйныя тэхналогіі: QR-коды і дапоўненую рэальнасць, — тлумачыць **галоўны рэдактар выдавецтва «Народная асвета» Алена ЛІТВІНОВІЧ.** — Пры навядзенні на іх смартфона можна ўбачыць, напрыклад, што адбываецца падчас лабараторнага вопыту ці эксперымента. Пры гэтым ніякіх асаблівых умоў для друкавання такіх падручнікаў ствараць не трэба: усё прадумваецца яшчэ на стадыі макета, а затым адпаведная праграма счытвання запампоўваецца вучнямі ў гаджэт.

Прадметам гонару «Народнай асветы» з'яўляецца падручнік па фізіцы ў мяккім інтэгральным пераплёце. Два гады таму гэта быў своеасаблівы эксперымент, таму што зараз вучэбны дапаможнік правяраецца на зносастойкасць. Заўважым, што тэрмін службы звычайнага падручніка ў цвёрдай вокладцы складае ад 4 да 5 гадоў (у залежнасці ад колькасці ў вучэбнай праграме гадзін, што выдзяляюцца на гэту дысцыпліну ў тыдзень).

Першы быў падручнік па фізіцы для 7 класа: на нацыянальным конкурсе «Мастацтва кнігі» рашэннем журы ён быў прызнаны «Падручнікам новага стагоддзя». Летась аналагічны падручнік у інтэгральным пераплёце атрымалі вучні 8 класа, а ў гэтым годзе выпусцілі падручнік ужо для дзевяцікласнікаў.

— У эксперыментальным варыянце фармат кнігі павялічаны, прымяняецца іншае размяшчэнне вучэбнага матэрыялу, рэалізаваная функцыя дапоўненай рэальнасці, якая дазваляе «ажывіць» вучэбны матэрыял, — расказвае Алена Літвінавіч. — Паглядзім, як будзе выглядаць наш дапаможнік праз чатыры-пяць гадоў актыўнай эксплуатацыі ў школе. Калі ён акажацца «жыццяздольным», то падобныя падручнікі будуць з'яўляцца і па іншых прадметах. Цікавасць да гэтага фармату ўжо актыўна праяўляюць стваральнікі падручніка па інфарматыцы.

ПА ШКОЛЬНЫЯ ВЕДЫ — У ІНТЭРНЭТ-КРАМУ

У выдавецтве «Вышэйшая школа», якое забяспечвае беларускіх школьнікаў вучэбнай літаратурай па замежных мовах, да пачатку навучальнага года выпушчана 17 найменняў вучэбных дапаможнікаў тыражом практычна 310 тысяч экзэмпляраў, а ўсяго запланавана 30 найменняў агульным тыражом больш за 500 тысяч экзэмпляраў. «Яшчэ 13 найменняў мы плануем выпусціць да канца каляндарнага года, таму што па іх дзеці пачнуць займацца толькі ў трэцяй чвэрці», — удакладніў **дырэктар выдавецтва Аляксандр НЯЧАЙ.** Ён адзначыў, што пачалі расці тыражы літаратуры па кітайскай мове. «Калі два-тры гады таму мы выдавалі 200—300 асобнікаў дапаможніка, то цяпер выпускаем 600 і больш, што сведчыць аб росце цікавасці да вывучэння кітайскай мовы», — растлумачыў дырэктар.

Пытанне, якое традыцыйна цікавіць школьнікаў і іх бацькоў: дзе можна набыць школьны падручнік для ўласнага карыстання? Напрыканцы навучальнага года ўсе дапаможнікі здаюцца ў школьную бібліятэку, але, напрыклад, яны вельмі патрэбныя вучням выпускных класаў, якія рыхтуюцца да паступлення...

— Мы гэты попыт адчуваем, — запэўнівае Вікторыя Калістратава. — Тыражы звычайна фарміруюцца зыходзячы з планаемага кантынгенту школьнікаў і тэрміну эксплуатацыі кнігі. Але мы заўсёды робім дадатковы тыраж і для рознічнага гандлю. Раней праз «Белкнігу» падручнікі рэалізоўваліся больш марудна, але цяпер мы супрацоўнічаем з інтэрнэт-крамай OZ.BY — там наш дадатковы тыраж разлятаецца літаральна за лічаныя месяцы.

Дарэчы, усе электронныя версіі падручнікаў, якія выкарыстоўваюцца ў адукацыйным працэсе, можна знайсці на Нацыянальным адукацыйным партале (www.adu.by). Яны даступныя для бясплатнай запампоўкі, а іх PDF-версіі дапоўнены гіперспасылкамі, якія дазваляюць пераходзіць на іншыя кампаненты вучэбна-метадычных комплексаў: хрэстаматыі, атласы, зборнікі задач і практыкаванняў, электронныя адукацыйныя рэсурсы... Падручнік сёння ўжо не разглядаецца як адзіная крыніца ведаў, а выконвае, хутчэй, навігацыйную функцыю і накіроўвае школьніка да дадатковых крыніц інфармацыі.

Надзея НІКАЛАЕВА.

«АБЫ НЕ ПРАПАЛА!»



Прыёмшчыца Кацярына ГУСЦІНОВІЧ увесь дзень на нагах. Узваж, дапамажы перанесці тавар, выдай грошы — і так амаль без перапынку.

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Следам за маці і сынам у дзвярах пункта прыёму з'явіўся сухенькі дзядуля ў кепцы. На старэнькім «Аісце» ён прыцягнуў мех і вядро, шчыльна набітыя чырвонай рабінай. Ягада лёгкая — усяго 29 кілаграмаў. Аплата — 11 рублёў.

— Не так ужо і мала, ўлічваючы, што кіроўца ў раёне за дзень зарабляе 13. Але ж то трэба з 8 да 17 у душнай кабіне круціцца, а тут раз-два — і гатова! — разважаюць мужыкі, якія стаяць у чарзе за дзедам.

Больш сур'ёзныя грошы можна зарабіць на здачы металалому. Моладзь, дарослыя, пенсіянеры вязуць яго на задні дворык пункта прыёму прычэпамі. Калі зірнуць у рабочы сшытак прыёмшчыцы Кацярыны Гусціновіч, то бачна, што толькі за некалькі ранішніх гадзін лунінчане паспелі здаць і звычайны чорны лом, і алюміній, і медзь.

— Метал прымаем толькі па пашпарце, усякае можа быць. Ёсць нядобрасумленныя таварышы, якія прыносяць скрадзеныя рэчы. Тады з імі ўжо міліцыя разбіраецца. Аднойчы крыжы з могілак былі, а сёння — некалькі дзясятка ўдастраляных гільзаў. Такое мы не маем права браць, канешне, — расказвае Каця. — Але ў цэлым, калі кожны пакапаецца на ўласным двары, у гаражы, на дачы, то сапраўды можна сабраць цэлы прычэп. Ёсць у некаторых спартыўны інтарэс да пошукаў непатрэбнага лому, які валяецца паўсюль. Двое вясковых мужчын сярэдняга ўзросту рэгулярна яго прывозяць: у іх мэта — назбіраць на аўтамабіль. Не тое каб патрэба вялікая, проста цікава.

Дарэчы, каб здаць тыя ж яблыкі, не абавязкова ехаць у нарыхтоўчы пункт. Прадукты і другасную сыравіну прымаюць усе крамы райспажыўтаварыства. Толькі нясі! Калі гаворка ідзе пра вялікія аб'емы, можна бясплатна выклікаць машыну з камбіната. Напрыклад, школы, якія традыцыйна займаюцца зборам пластыку і макулатуры, у канцы навучальнага года так і робяць. Таксама магчымасцю карыстаюцца тыя, у каго дома шмат металалому.

ДЗЕ КУПЛЯЦЬ БЕЛАРУСКАЕ?

— Наш камбінат — не проста «купі-прадай». Паколькі ён нарыхтоўча-прамысловы, дзейнасць у яго развіваецца па некалькіх кірунках. Па-першае, гэта, канешне, нарыхтоўкі — ад насельніцтва і гаспадарак, як сельгаспрадукцыі, так і другаснай сыравіны. Па-другое, мы займаемся вытворчасцю: што купілі, тое і перарабляем. Таму структура камбіната, апрача пунктаў прыёму, складоў і халадзільнікаў, уключае хлебныя, каўбасны і швейны цэхі. Маецца свая бойня, — расказвае дырэктар прадпрыемства Іван Соц.

Металалом праходзіць мінімальную сарціроўку і адразу адпраўляецца ў кантэйнеры на чыгунку, якая знаходзіцца праз дарогу ад пункта прыёму.

Асаблівую ўвагу аддаюць перапрацоўцы другаснай сыравіны. У раёне толькі два прадпрыемствы, якія займаюцца яе прыёмам, — НПК «Палессе» і жыллёва-камунальная гаспадарка.

— Нашы партнёры — напрыклад, кампанія «Беларэжскія віны» — зацікаўленыя ў тым, каб да іх вярталі цэлыя шкляныя бутэлькі, і гатовыя за гэта плаціць значна больш, чым каштуе шклабой, — зазначае Іван Іванавіч. — Ды і мы самі можам ганарыцца тым, што з'яўляемся поўнасцю безадходнай прамысловасцю. У нас на перапрацоўку ідуць нават косткі жывел (з іх робяць муку).

Па словах кіраўніка, вёска ўжо зусім не тая, што 70-50 гадоў таму. Калі не браць у разлік ягада (Лунінеччына, як вядома, — клубнічная сталіца Беларусі), то народ не асабліва імкнецца зарабіць грошай на лішках сельгаспрадукцыі.

— Ды і ці ёсць тыя лішкі? Гароды зусім не такія, як калісьці былі. З другога боку, набываць памідоры і гуркі ў крамах у сезон нашы людзі яшчэ не прызвычаіліся. Нават у кожнага гараджаніна ёсць невялічкі ўчастак, дзе расце ўсё неабходнае для летняй салаты і кансервацыі на зіму. Але не больш, — разважае Іван Іванавіч. — Прайшлі і тыя часы, калі на ўласных падвор'ях гадавалі свіней. За паўгода ў найлепшым выпадку нам могуць здаць усяго 5-6 кабанчыкаў з раёна. Справа нават не ў тым, што камерсанты перабілі цэны. Відавочны факт: вясковы люд перастаў трымаць скаціну. Нават калі ў каго і засталіся свінні ці карова, то выключна для асабістых патрэб. Таму нарыхтоўшчыкам цяпер давялося пераключыцца на больш цеснае супрацоўніцтва з фермамі. У прыватнасці, мы трымаем сувязь са свінакомплексамі на Піншчыне і Пружаншчыне.

Сёння склады камбіната толькі рыхтуюцца да будучага ўраджаю і пакуль амаль пустыя. Акрамя яблыкаў, якія пойдуць на перапрацоўку, тут 2,5 тоны салёных гуркоў, крыху свежай капусты і морквы. У сетках заўважаю бульбу: вялікая, цвёрдая, жоўтая. Пра такую кажуць «адна ў адну». Прызнацца, падобны тавар мне ў сталічных крамах амаль не трапляецца. Там «беларускі скарб» звычайна маленькі, белы і ў выніку нясмачны. Часта ўвогуле нават не беларускі, а егіпецкі ці расійскі. Узнікае пытанне: куды ідзе айчынны якасны прадукт?

— Што датычыцца менавіта бульбы, то камбінат пастаўляе яе і гародніну ў бальніцу і дзіцячыя садкі. Мы выйгралі гэтае права праз тэндар. Яшчэ адна важная задача нарыхтоўшчыкаў Лунінеччыны — стабілізацыйны фонд раёна. Фактычна яны адказваюць за тое, каб у кожнай краме райспажыўтаварыства да вясны была свежая бульба і гародніна. І не чужая па вялізных коштах, а свая. Ёсць план: нарыхтаваць да 1 лістапада 80 тон капусты, 40 — цыбулі, 20 — буракоў, 10 — морквы і 100 — бульбы. Каб з сярэдзіны восені і да наступнага лета магазінныя прылаўкі не пуставалі. Як паказвае практыка, нават у вяскоўцаў можа раптоўна скончыцца цыбуля ці капуста, а вітамінаў хочацца, асабліва вясной, — дзеліцца Іван Іванавіч. — Працуем з айчыннымі кампаніямі — «Белавежскія віны», Пінскі вінаробны завод, Маларыцкі кансервавагароднінасушыльны камбінат, Гарынскі агракамбінат, Маладзечанскі харчовы камбінат. Нарыхтоўвалі для іх ягады — клубніцы і вішні. Цяпер пайшла чырвоная рабіна, якая больш запатрабаваная ў Польшчы, таму яе адправім на экспарт.

Прабіцца ў сеткавыя крамы, якія цяпер распаўсюджаны па краіне, няпроста. У іх свае пастаўшчыкі і, як у любога бізнесу, мэта — максімальна выгадныя па грашах дамовы. Якасць і смак — рэч другасная.

ХТО ЗАДАЕ ТРЭНДЫ?

Пасля дня, праведзенага з лунінецкімі нарыхтоўшчыкамі, напрошваецца выснова: сёння камбінаты для беларусаў у рэгіёнах — гэта хутчэй не спосаб зарабіць грошай. Не будзем браць у разлік тых, каму не хапае на «апахмяліцца з ранку» (такія сапраўды ёсць паўсюль, але іх няшмат). Складалася ўражанне, што сельгаспрадукцыю нясуць здаваць па добрай старой звычцы: «Абы не прапала!» Дбайны гаспадар ніколі не пакіне ў садзе ці на гародзе загніваць ураджай, нават калі ён яму не трэба. Ён замарочыцца, патраціць час і сілы, але аддасць яблыкі ці рабіны туды, дзе яны пойдуць на карысць. У гэтым адчуваецца пэўны элемент вясковай культуры, у тым ліку экалагічнай.

Задаток перечисляется на р/с BY21BPSB30121543370109330000 в ОАО «БПС-Сбербанк», г. Минск, BIC банка BPSBBY2X. Получатель — РУП «Институт недвижимости и оценки», УНП 190055182. Назначение платежа: задаток для участия в аукционе 30.08.2019 (ЗАО «Отдых-2010», ЛотNo1). Заявления на участие и необходимые документы принимаются в рабочие дни с 8.30 до 12.00, с 13.30 до 16.00 по адресу: г. Минск, ул. Комсомольская, 11, каб. 7. Окончание приема заявлений — 28.08.2019 в 11.00. Организатор торгов вправе отказаться от проведения аукциона в любое время, но не позднее чем за три дня до наступления даты его проведения. Первое полное извещение о проведении аукциона опубликовано в газете «Звязда» от 02.07.2019

Организатор аукциона: 8 (017) 324-70-57, 8 (029) 356-90-03, 8 (029) 550-09-52 www.ino.by, e-mail: torgi@ino.by

На адкрытай прасторы

ГОРАД ГУЧЫЦЬ

Сёння ў Мінску пройдзе перадапошні канцэрт «Класікі ля Ратушы»

На чарговым канцэрце ў сталічным Верхнім горадзе загучаць Эдвард Грыг, Фрыдэрык Шапэн, Клод Дэбюсі, а на вялікім экране будзе паказаны натхнёны «Карцінкамі з выстаўкі» Мадэста Мусаргскага анімацыйны фільм. Перадапошні вечар фестывалю павінны зрабіць Дзяржаўны камерны аркестр Беларусі і беларускі піяніст-віртуоз Цімур Сергееня. Сёлетняй «Класікі ля Ратушы» засталося няшмат.

Першай часткай канцэрта стане выкананне аркестрам Моцарта, Грыга, Чайкоўскага і, апроч гэтага, тых самых «Карцінак з выстаўкі» Мусаргскага ў аркестроўцы Юлія Туроўскага — віяланчэліста і дырыжора, які заснаваў I Musici de Montreal Chamber Orchestra, што існуе і дае канцэрты дагэтуль. Падчас выканання Мусаргскага на вялікім экране будзе паказвацца фільм «Танцуючыя малюнкі з выстаўкі» дачкі Юлія Туроўскага — мастачкі Наталлі Туроўскай, што якраз натхнілася гэтым цыклам п'ес.

Ужо сталы ўдзельнік «Класікі ля Ратушы» беларус Цімур Сергееня — між іншым, прафесар Вышэйшай школы мастацтваў Каралеўскай кансерваторыі Гента ў Бельгіі — гэтым разам будзе саліраваць: у другой частцы канцэрта ён выканае Шапэна, Рахманінава, Ліста, Дэбюсі, Мендэльсона ды іншых.

Апроч сённяшняга, у Мінску пройдзе яшчэ адзін класічны канцэрт у рамках «Класікі ля Ратушы» — 31 жніўня пад адкрытым небам сыграе беларускі Прэзідэнцкі аркестр і завершыць «сезон».

Нагадаем, сёлетні фестываль — пяты, юбілейны, таму канцэрты былі арганізаваныя ў пяці беларускіх гарадах. Апроч Мінска, музычныя калектывы сыгралі ў Віцебску, Гродне, Брэсце і Гомелі.

Як звычайна, уваход на канцэрт — бясплатны. Прылучыцца да выступленняў можна таксама праз відэасэрвіс VOKA, дзе вядуцца прамыя трансляцыі мінскіх канцэртаў і захоўваюцца іх запісы. Фестываль арганізуецца пры падтрымцы кампаніі A1 і Мінгарвыканкама.

Сафія ПАЛЯНСКАЯ.

У закрытай прасторы

«30-МІНУС»

Маладыя творцы дэманструюць свой патэнцыял на першым трыенале

Адмыслова і толькі для іх: дзяржава ўзяла на сябе клопат пра маладое айчыннае мастацтва. Нарэшце, бо зрабіць гэта трэба было даўно, а то калі чагосьці няма, ініцыятыву перахопліваюць неабыякавыя. Што і адбылося, калі «Белгазпрамбанк» заснаваў «Восеньскі салон» і запрасіў да ўдзелу творцаў да сарака гадоў. Рэзананс атрымаўся вялікі, значыць, запатрабаванасць ёсць. Відавочна, творчыя спаборніцтвы актывізуюць не толькі саміх удзельнікаў, але і гледача. Чым жа прынцыпова адрозніваецца трыенале, падтрыманае Міністэрствам культуры?

Па-першае, тут свая версія ўзросту маладосці — да 31 года. Да таго ж удзельнікі падзелены на тых, хто пакуль вучыцца, і маладых прафесіяналаў. Па-другое, у аглядзе творчых сіл здзейнічаны прадстаўнікі вядучых навучальных устаноў рэспублікі, і не толькі сталічных, што, безумоўна, важна, бо дае стымул развівацца незалежна ад месца жыхарства. Па-трэцяе, такі агляд плануецца праводзіць раз на тры гады. Таксама слушна: падрастуць новыя творцы, а развіццё ўпадабаных мінулым разам мастакоў будзе больш відавочнае.

Чацвёртае: узнагароды будуць уручацца ў дзевяці намінацыях, восем з якіх — «творчыя»: «Жывапіс», «Скульптура», «Графіка», «Манументальнае і манументальна-дэкаратыўнае мастацтва», «Дэкаратыўна-прыкладное мастацтва», «Навацыя» (арт-праект, інсталяцыя), «Мастацтвазнаўства і мастацкая крытыка», «Куратарскі праект у сферы выяўленчага мастацтва» (ужо ёсць разуменне, што гэта асобны від творчасці). Дзявятая — прыз глядацкіх сімпатый, як жа без яго: на ўваходзе выдаюць анкеты для галасавання, а які глядач не ацэніць прапанову асабіста паўплываць на развіццё айчыннага мастацтва?

Пераможцаў у творчых намінацыях вызначыць журы ў складзе трынаццаці спецыялістаў на чале з кандыдатам мастацтвазнаўства Ірынай Скварцовай. Вось яшчэ адно адрозненне ад «Восеньскага салона»: трыенале ацэньваюць айчынныя прафесіяналы — выкладчыкі навучальных устаноў, а таксама крытыкі і журналісты, якія пішуць пра мастацтва (і, адпаведна, яго асэнсоўваюць). Праца ў журы адказная, бо лаўрэатам, акрамя дыпломаў, прызначаюцца грашовыя прэміі ў памеры шасцідзесяці базавых велічынь.

Удзельнікі першага трыенале вызначаны адборачнай камісіяй: з двухсот заявак на выстаўку трапіла сто сорак работ. «Творчая моладзь актыўна адгукнулася на ініцыятыву. Выстаўка дэманструе высокі ўзровень дасягненняў нашых мастацкіх школ», — адзначыла прадстаўнік Міністэрства культуры Ірына ДРЫГА.

І вось тут, каб упэўніцца ў справядлівасці вітальных словаў, што гучалі падчас адкрыцця, рашуча перахадзіш да прагляду. Амаль два паверхі Палаца мастацтва. Некаторыя творы (ці рэплікі альбо творы з серый) ужо даводзілася бачыць на іншых выстаўках, некаторыя імёны аўтараў ужо вядомыя якраз дзякуючы «Восеньскім салонам» ці іншым імпрэзам — выдатна, што моладзь скарыстоўвае ўсе магчымасці сябе паказаць. Але цікава не столькі глядзець на імёны, колькі чытаць думкі: што хвалюе нашу моладзь і чым яна жыве?

Ад моладзі заўсёды чакаеш нейкага выбуху. Страсення. Стракатасці думак і небанальнага бачання. А яшчэ пробы самых розных тэхнік, нават аўтарскага вынаходніцтва. Каб знайсці гэта на трыенале, давядзецца пахадзіць і вельмі пільна папрыглядацца. Выстаўка маладых беларускіх творцаў дэманструе рысы і дамінанты айчыннай мастацкай школы, якая робіць стаўку на галоўнае: уменне маляваць. Мастак жа і павінен гэта рабіць, ці не так? — задасць пытанне глядач, які сочыць за выстаўкамі. Ён мае ўсе шанцы парадавацца: моладзь трымае марку, яна добра вучыцца ў тых, хто добра вучыць, і забяспечвае працяг галоўных тэндэнцый беларускага мастацтва, з якіх варта вылучыць некаторыя найбольш відавочныя.

Гістарызм. Зварот да тэмы гістарычнай памяці, да вех і асоб мінуўшчыны. Тая лінія, што акрэслілася ў 80-90-я гады мінулага стагоддзя, трымаецца як актуальная і сёння. Магчыма, таму, што моладзь сапраўды засвойвае ўрокі гісторыі і тых настаўнікаў, для якіх істотны патрыятычны кірунак, калі ідэя і думка пераважаюць прагу фармальных пошукаў. Праўда, адно другому не перашкаджае. Дастаткова паглядзець на «Караля» Ганны Плотнікавай, якая стварыла партрэт з каменю, латуні і жалеза. Але і ў традыцыйным жывапісе гістарызм дапамагае ствараць адмысловую аўру, як гэта адбылося ў работах Алесі Скарабагатай, зоркі «Восеньскіх салонаў», якая цудоўна валодае тэхнікай дакладнай прамалёўкі і перадачы рэчаіснасці.

Зрэшты, не толькі яна. Такіх работ, дзе выяўленчае мастацтва даказвае, што можа спрачацца з фатаграфіяй, на гэтай выстаўцы шмат. І гэта яшчэ адна істотная тэндэнцыя ў маладым беларускім мастацтве — традыцыяналізм. Як тэматычны (мы натхняемся навакольлем, людзьмі, кветкамі), так і традыцыяналізм паводле мастацкіх стыляў. У нас традыцыйна моцная графіка — і мы яе бачым. У нас традыцыйна цікавае дэкаратыўна-прыкладное мастацтва — і яно ёсць. У нас традыцыйна моцны малюнак — і наша моладзь не цураецца рэалізму, захапляецца стылямі, што нарадзіліся ў XX стагоддзі, і стварае, каб было прыгожа. Часам нават здаецца, яна падкрэслена раўняецца на папярэднікаў, імкнецца рабіць правільна.

Магчыма, гэта яшчэ адна якасць нашага маладога мастацтва — павага да настаўнікаў і таго найлепшага, што ёсць у айчыннай школе. Ці гэта проста творчая сціпласць (каб не выпячваць сябе і свой погляд)? Але мастацтва развівалася тады, калі знаходзіліся творцы, якія імкнуліся рабіць не так, як рабілі папярэднікі, і ствараліся сваю рэчаіснасць. Некаторыя сталыя аўтары выдатна гэта дэманструюць і даказваюць, што творчая маладосць — гэта калі ты можаш здзіўляць, уражваць, нават шакаваць.

Магчыма, да таго, каб эксперыментаваць з рознымі стылямі і матэрыяламі і выпрацаваць аўтарскую тэхніку, трэба саспець. Хоць калі прыгледзецца, тут ёсць на што звярнуць увагу: творы Кірыла Дзямура створаны ў кірунку алгарытмічнага мастацтва, твор у аўтарскай тэхніцы прапанавала Дар'я Кудраўцава, шэраг твораў выкананы ў змяшаных тэхніках. Між тым канцэптуальныя праекты і інсталяцыі пакуль прывіваюцца не вельмі актыўна.

Пабачанае ўсё разам прымушае разважаць. Не столькі над жыццём (якое мастацтва павінна асэнсоўваць), колькі над жыццём у мастацтве, якое маладыя людзі цяпер выбіраюць. Быць ім кроплямі ў агульнай плыні альбо нараджаць ураганы ўласным непадабенствам, непрычасанасцю, выбуховасцю? Тры гады пачакаем...

А пакуль: мастацкая выстаўка па выніках конкурсу «Трыенале маладых мастакоў» будзе экспанавацца да 25 жніўня. З улікам таго, што падобны агляд мае на мэце стварыць панараму, мала. Арыентаваліся, відаць, на асноўных гледачоў маладых твораў — такіх жа маладых людзей, у тым ліку студэнцкую моладзь, якія цяпер на канікулах.

Арганізатарамі конкурсу выступаюць Міністэрства культуры, Нацыянальны гістарычны музей, Беларуская дзяржаўная акадэмія мастацтваў і Беларускі саюз мастакоў. За ініцыятыву дзякуй, але наконт рэалізацыі да другога разу ёсць над чым папрацаваць — і над тэрмінамі, і над фарматамі. Каб экспазіцыя маладых была насамрэч «маладой».

Ларыса ЦІМОШЫК.
Фота Кастуся ДРОБАВА.

Алесь РОДЗІМ:

«Рабілі «афармілаўку» для калгасаў, вярталіся ў свае падвалы і працягвалі маляваць»

У будынку легендарнага берлінскага арт-сквота Тахелес больш не адбываецца ні канцэртаў, ні мастацкіх выставак, а калісьці ён быў цэнтрам прыцягнення ўсіх творчых людзей. Свой унёсак у яго феномен зрабілі і беларускія мастакі, у прыватнасці Алесь Родзім, які правёў у Берліне дванаццаць гадоў. Беларускаму складніку Тахелеса прысвечаны арт-фестываль «Міфалагема тысячагоддзя», што адкрыўся ў прасторы Ок16 15 жніўня. Яго цэнтрам стаў аднайменны твор Родзіма, які той пісаў цягам пяці гадоў. Апроч татальнай экспазіцыі мастака фестываль запрасіў да ўдзелу беларускіх і замежных аўтараў, некалі датычных Тахелеса. Напярэдадні адкрыцця мы сустрэліся з Алесем Родзімам і з першых вуснаў пачулі, як працавалася ў БССР, як французскі тэатр сыграў для яго спектакль і як мастака выводзілі з яго ж выстаўкі.

Фота Ганны ЗАНКАВІЧ.

— Калі не памыляюся, «Міфалагему тысячагоддзя» вы напісалі пасля таго, як банк у якасці новага ўласніка заўчасна захапіў Тахелес, то-бок у момант пэўнай жыццёвай нераўнавагі.

— Пачаў пісаць я прыблізна за два з паловай гады да захопу, але пасланцы банка — гэта быў вядомы Hamburg Nordbank з велізарным абаротам — прыходзілі ўжо тады. Новы ўласнік захацеў завалодаць Тахелесам на два гады раней прызначанага тэрміну, хоць будынак усё роўна б яму адышоў, і пачаў прысылаць мне хадакоў, якія тлумачылі, што ў іх прападаюць вялікія грошы, ім неабходны Тахелес, таму я павінен прадаць ім «сваю» тэрыторыю. Мая выстаўка займала шосты паверх будынка, то-бок прыблізна тысячу квадратных метраў, і за яго вызваленне мне прапаноўвалі сумы з сямю нулямі, бо думалі, што без маёй экспазіцыі Тахелеса ў рэшце рэшт не стане. Але паколькі я не мог удзельнічаць у гандлёвых аперацыях, я падзякаваў за ўвагу і сказаў: «Звяртайцеся ў адміністрацыю, як яна вырашыць, так і будзе». Дырэктар Марцін Райтар выгнаў прадстаўнікоў банка і нагадаў пра афіцыйную дамову з гарадской уладай, згодна з якой Тахелес заставаўся арт-цэнтрам да 2012 года. На нейкі тэрмін усё сцішылася, я па-ранейшаму ўставаў у шэсць і спакойна маляваў да адкрыцця Тахелеса для наведвальнікаў, але ў адну з раніц пачуў незразумелыя гукі і раптам раз — дзверы, прычым металічныя, вываліліся, і мяне акружыла чалавек трыццаць дзецюкоў у чорным адзенні. Я быў разгублены. Іх адвакат зачытаў нейкую паперу на нямецкай, якую я дрэнна зразумеў, але адчуў, што адбываецца нешта непрыемнае, мяне схапілі пад рукі і пачалі выводзіць. Я кажу: «Пачакайце, ці можна хоць бы ўзяць свае карціны?» — «Не, нельга» — «А фарбы?» — «Не, нельга» — «Добра, а камп'ютар?» — «Не, нельга» — «А адзенне?» — «Не, нельга». Як я быў, так мяне праз шэсць паверхаў і спусцілі.

— Але правоў на гэта яны ўсё ж не мелі?

— А дзявятай прыйшоў дырэктар і пасправаваў вызначыць, што адбываецца. Яму паказалі тую ж паперу, што і мне, — гэта была пастанова суда аб тым, што банку дазволена забраць памяшканне. Я перамясціўся на пяты паверх, зрабіў там вялікую прысвечаную банку інсталяцыю ў выглядзе спрута, стаў даваць інтэрв'ю натоўпу журналістаў, а яны ў рэшце рэшт высветлілі, што ніякай пастановы суд не выдаваў. Справа атрымала розгалас у нямецкіх і замежных СМІ, і мая выстаўка стала шырока вядомая ў Еўропе. Хоць «Міфалагему» я пачаў раней, «закруцілася» яна менавіта ў гэты час. Я не люблю скандалы, але гэты даў мне натхненне: у чатырох частках, з якіх складаецца палатно, я адсочваю розныя з'явы сучаснасці і іх уплыў на чалавека і грамадства.

— Ведаю, што вы любіце працаваць у выставачнай прасторы навідавоку ў публікі: наведвальнікі могуць хадзіць вакол, нешта запытваць, адцягваць увагу. Здаецца, што для работы вам патрэбны хаос.

— Відаць, ёсць такое. У Тахелесе я рана ўставаў і на некалькі гадзін заставаўся са сваімі карцінамі сам-насам, потым адчыняліся дзверы і ішоў натоўп. Зразумела, 500-1000 чалавек кожны дзень — гэта зашмат, мне даводзілася чуць розныя пытанні, што, як, чаму. Я адказваў, адкуль я, апавядаў пра Беларусь, а тады яе яшчэ мала ведалі, паказваў краіну на карце. Мая выстаўка ў Тахелесе доўжылася дванаццаць гадоў, і ўвесь гэты час гледачы падштурхоўвалі мяне да эксперыментаў. Я «запускаў» новае палатно і глядзеў на рэакцыю, бачыў, да якой ступені варта развіваць тую ці іншую карціну, праз гэтую камунікацыю ў галаве з'яўлялася шмат ідэй, якія шкрэбліся, каб я іх увасобіў. Увогуле за гэты час я адчуў, што мова мастацтва зразумелая кожнаму, няважна, адкуль ты — з Індыі, Кітая ці востраў Пасхі, хоць з Антарктыды.

— А вы помніце якія-небудзь каментары ў адрас вашых твораў?

— Іх было шмат: я завёў для гэтага кнігу водгукаў і мяняў яе кожны месяц. Неяк адзін французскі тэатр прыйшоў да мяне ў Тахелес, прызнаўся, што натхняецца энергетыкай маіх твораў, і на фоне маіх карцін сыграў для мяне спектакль. А колькі прыязджала музыкаў з усёй Еўропы: яны ігралі, давалі мне інструменты, а я рабіў выгляд, што іграю. Былі, вядома ж, і вусныя каментары, але звычайна палотны паглыналі гледачоў. Тахелес паспяхова прадаваў прынты маіх работ, на чым трымаліся і сам арт-цэнтр, і фестывалі «Дах», куды мы запрашалі беларускіх мастакоў, музыкантаў, тэатралаў і перформераў. Гэта і ёсць водгук.

— У Тахелесе выставілася вялікая колькасць беларускіх мастакоў: якое значэнне ён мае для беларускага мастацтва?

— Тахелес сыграў, я лічу, вельмі вялікую ролю ў падтрымцы беларускіх нонканфармісцкіх мастакоў. У 2000-я розніца паміж афіцыйным і неафіцыйным мастацтвам была вельмі вялікая, сёння такой прорвы ўжо няма, ты можаш рабіць што заўгодна і, калі ёсць сродкі, выстаўляцца з чым заўгодна. А тады андэграўнд моцна вылучаўся і Тахелес падтрымліваў менавіта неафіцыйных мастакоў. Разам з сябрам Зміцерам Юркевічам мы арганізоўвалі фестывалі «Дах», якія давалі магчымасць творцам з Беларусі выплёскваць свае ідэі і назіраць, як яны ўспрымаюцца, а праз Тахелес заўсёды праходзіла шмат людзей. Гэта стала добрым досведам для нашых аўтараў і грунтам для сучаснага мастацтва ўвогуле, таму значэнне Тахелеса, канешне, вялікае. Я ўжо не кажу, што гэтая пляцоўка дала асабіста мне: пасля першай беларускай выстаўкі ў 2001 годзе мне прапанавалі застацца на год, а застаўся я ў выніку на дванаццаць.

— А якое месца Тахелес займаў у берлінскай культуры?

— Вакол Тахелеса знаходзілася каля сотні галерэй: на цырымоніі адкрыцця іх выставак народ збіраўся, а пасля туды ніхто не заходзіў, памяшканні стаялі пустыя. А Тахелес — легендарнае, намоленае месца, дзе мастакі трымалі свае атэльe адкрытымі, кожны раз адбывалася нешта дзіўнае — то перформансы, то канцэрты, ён даваў публіцы пажытак для розуму. Тахелес прыцягваў, значыць, такая падача мастацтва, калі ўсё ствараецца літаральна на вачах і некалькі з'яў адбываецца адначасова, самая цікавая. З раніцы да позняй ночы там віравала жыццё.

— У вас атрымалася транспартаваць адтуль усе вашы творы?

— Я не стараўся забраць усё, але дзевяноста працэнтаў вывез. Я не трачу сувязі з Берлінам і кожны год удзельнічаю ў фестывалях, на якія мяне запрашаюць, — Freqs of Nature, Odyssee, Wurzeln. У апошнім Wurzeln, між іншым, удзельнічалі чатыры беларусы.

— Вы ўвогуле кіруецеся мэтай прадаваць свае мастацтва? Асноўная частка вашых палотнаў мае такія памеры, якія не дазволіш сабе ў кватэры. Дзе вы іх бачыце?

— Раней яны прызначаліся Тахелесу: натоўп ішоў і ахаў, гэтага было дастаткова. У Берліне велізарная колькасць творцаў, вышэйшыя навучальныя ўстановы кожны год выпускаюць тысячу мастакоў, таму канкурэнцыя ў горадзе каласальная, барацьба ідзе за кожны квадратны метр выставачнай плошчы, са слязамі і ўсім, чым заўгодна. Я ж валодаў цэлым паверхам, маёй задачай было толькі працаваць, мне не трэба было прадаваць палотны. Тым больш продаж прынтаў дзесяць разоў акупіў кожную маю работу.

— А зараз?

— Зараз трэба мяняцца, Мінск патрабуе невялікіх фарматаў, яны мне таксама цікавыя. Час ад часу іх купляюць, нарэшце, колькі горад можа гэта сабе дазволіць. Была ў мяне адна карціна невялікага фармату ў Тахелесе, дык вось яе ў свой час, калі ўсіх ахапіў сон, скралі. Я спакойна да гэтага паставіўся, было б жаданне, усё можна аднавіць.

— Вашы работы дарагія?

— Звычайна неяк дамаўляемся аб кошце. Мастак не павінен думаць пра грошы: калі ён на іх засяродзіцца, будзе «гнаць» прадукцыю, а мастацтва — не прадукцыя.

— Хачу згадаць кансерватыўныя, у тым ліку ў стаўленні да мастацтва, 1970-1980-я. Як вы сябе пачувалі ў гэты час і ці даводзілася вам адстойваць сваё мастацтва?

— Два гады ў тэатральна-мастацкім інстытуце я адвучыўся на кафедры дызайну, а дызайн у тыя часы лічыўся нефармальным мастацтвам. Я адчуваў сябе вельмі свабодна, пакуль не перавёўся на жывапіс. Першы педагог яшчэ даваў мне магчымасць рабіць тое, што я хачу, але потым прыйшоў поўны атас — з'явіліся іншыя кіраўнікі, якія ў першую чаргу адсочвалі адпаведнасць ідэалогіі. Калі яны ўбачылі мае кампазіцыі, захацелі выключыць з інстытута. Удзельнічаць у афіцыйных выстаўках было немагчыма, я пару разоў сунуўся, мне далі ад варот паварот і я зразумеў, што не варта нават спрабаваць. Таму сваё мастацтва я паказваў толькі сваім сябрам: тады было шмат маладзёжных плыняў, я ў іх уваходзіў і нават іграў у музычнай групе. Адна з маіх майстэрняў знаходзілася ў бамбасховішчы: там збіралася шмат нефармалаў — у Мінску была цэлая суполка такіх людзей, яны і давалі ацэнку маім творам. У гэтым было маё сілкаванне. А там ужо прыйшоў новы час, у 1990-х адзін куратар, які ўзначальваў Цэнтр сучасных мастацтваў у Галандыі, запрасіў мяне выставіцца, і гэта была мая першая выстаўка пасля таго, як упаў жалезны занавес.

— Калі андэграўндная тусоўка, да якой вы належалі, існавала амаль падпольна, на што вы жылі?

— Тады ўсё было танна. А зараблялі мы халтурай — «афармілаўкай» для калгасаў. Прыязджалі з сябрамі ў горад ці мястэчка, ішлі да старшыні калгаса і прапаноўвалі зрабіць дошку гонару, аформіць паказчыкі спаборніцтваў і так далей. Таго, што нам плацілі, цалкам хапала на жыццё, мы вярталіся ў свае падвалы і працягвалі маляваць.

— Чаму, як вы думаеце, маючы Віцебскую школу і УНАВІС, беларускае мастацтва ўсё роўна было кансерватыўным?

— Пра гэты УНАВІС мы даведаліся і сталі яго вывучаць толькі падчас перабудовы, а да гэтага быў настолькі моцны ідэалагічны прэсінг, што нікому не давалі нават рота адкрыць пра існаванне Малевіча, Шагалаў і Суціных. Мастацкія саветы, напрыклад, пры Саюзе мастакоў, на дух не пераносілі ўсё абстрактнае, нефармальнае, што нейкім чынам рабіла замах на іх ідэалагічныя ўяўленні. Усё было пад жорсткім кантролем, таму інфармацыю мы чэрпалі з замежных часопісаў, якія даставаліся з-пад палы, напрыклад з польскага часопіса Przyjaźń artystyczna.

— Ці магчыма ў Мінску стварыць нешта падобнае на Тахелес?

— Два гады такім месцам быў «Верх», шкада, што ён закрыўся. Некаторы час, пэўна, такой прасторай будзе Ок16, але зноў-такі гэта эксперымент, невядома, як яго ўспрыме грамадства. Можна нешта такое рабіць у Палацы мастацтва і даследаваць іншыя гарады.

— Як вы ставіцеся да таго, што вас называюць самым вядомым беларускім мастаком?

— Я такое не люблю. Такія прыстаўныя лесвіцы не вельмі добра ўздзейнічаюць на псіхіку, таму я на іх заплюшчваю вочы. Насамрэч усё вызначае толькі час, а абазваць адно аднаго можна кім заўгодна.

Гутарыла Сафія ПАЛЯНСКАЯ.

ПРАВИЛА РЕКЛАМНОЙ ИГРЫ «ОЛЕ-ОЛЕ, БУДЬ В ИГРЕ!»

1. Настоящая рекламная игра называется «Оле-оле, будь в игре!» (далее – Игра), проводится в соответствии с условиями настоящих правил (далее – Правила) согласно требованиям законодательства Республики Беларусь без взимания с участников Игры платы.

2. Сведения об организаторе и заинтересованном лице.

2.1. Организатором Игры является Общество с ограниченной ответственностью «Яскрава», УНП 191548102, зарегистрировано 16 ноября 2011 г. решением Минского городского исполнительного комитета в Едином государственном регистре юридических лиц и индивидуальных предпринимателей за № 191548102 (далее – Организатор).

2.1.1. Юридический адрес и местонахождение Организатора: 220073, Республика Беларусь, г. Минск, ул. Ольшевского, 22, п. 13, к. 407.

2.1.2. Электронный адрес Организатора: visa@yaskrava.by.

2.2. Заинтересованным лицом Игры является Общество с ограниченной ответственностью «ФК БАТЭ», УНП 690022164 (далее – Заинтересованное лицо).

2.2.1. Юридический адрес и местонахождение Заинтересованного лица: 222120, Республика Беларусь, г. Борисов, пр. Революции, 16, пом. 7.

2.2.2. Электронный адрес Заинтересованного лица: club@fcbate.by.

3. Территория проведения Игры – Республика Беларусь.

4. Срок начала и окончания Игры – с 19.08.2019 г. по 17.12.2019 г., включая срок выдачи выигрышей и опубликования результатов проведения Игры.

5. Состав комиссии по проведению Игры.

5.1. Председатель комиссии – индивидуальный предприниматель Пелешок Ирина Владимировна.

5.2. Члены комиссии:

5.2.1. Серкутьев Владислав Валерьевич – специалист по работе с клиентами ООО «Яскрава»;

5.2.2. Марченко Наталья Олеговна – начальник департамента развития ООО «ФК БАТЭ»;

5.2.3. Конопляникова Наталья Ивановна – директор Департамента электронного и карточного бизнеса ОАО «БПС-Сбербанк»;

5.2.4. Дробушевич Антон Геннадьевич – юрисконсульт Ассоциации интерактивной рекламы.

6. Игра проводится в целях увеличения выпуска кобрендинговых банковских платежных карт Visa (далее – «кобрендинговая карта», «кобрендинговая карточка», «Карточка») с нанесенной на них информацией о Заинтересованном лице, выпущенных в обращение банком-эмитентом ОАО «БПС-Сбербанк» (далее – Банк).

6.1. При использовании в Правилах термин «кобрендинговая карта», «кобрендинговая карточка» используется в значении, определенном статьей 273 Банковского кодекса Республики Беларусь: «Банковская платежная карточка – платежный инструмент, обеспечивающий доступ к банковскому счету, счетам по учету банковских вкладов (депозитов), кредитов физического или юридического лица для получения наличных денежных средств и осуществления расчетов в безналичной форме, а также обеспечивающий проведение иных операций в соответствии с законодательством Республики Беларусь».

7. Участники Игры.

7.1. Участниками Игры могут быть физические лица, достигшие 18 лет, – граждане Республики Беларусь, а также иностранные граждане и лица без гражданства, имеющие вид на жительство в Республике Беларусь и постоянно проживающие на территории Республики Беларусь.

7.2. Участником Игры не может быть лицо, состоящее в трудовых отношениях с Организатором, супруг (супруга) такого лица, его близкие родственники, а также лица, находящиеся с таким лицом в отношениях свойства. Члены комиссии не могут быть участниками рекламной игры.

8. Состав и размер призового фонда.

Таблица 1

№ п/п	Наименование и состав приза, участвующего в розыгрыше	Наименование приза далее по тексту	Кол-во (шт.)	Сумма за 1 ед., бел. руб.	Сумма всего, бел. руб.
1	Автомобиль легковой GEELY EMGRAND 7 Седан Comfort 1,8 бензин, Y4K8844W9J000959 (базальтово-серый) стоимостью 28 047 бел. руб. + денежная сумма в размере 4171,36 бел. руб.	Автомобиль Geely	1	32 218,36	32 218,36

8.1. Призовой фонд Игры составляет 32 218,36 (тридцать две тысячи двести восемнадцать белорусских рублей 35 коп.) и формируется за счет денежных средств и имущества Заинтересованного лица.

9. Условия участия в Игре.

9.1. Для участия в Игре участнику необходимо в период с 00 часов 00 минут 19.08.2019 г. и не позднее 23 часов 59 минут 18.11.2019 г. включительно (далее – период участия):

9.1.1. Являться и/или стать держателем кобрендинговой карты, оформив ее в любом отделении Банка или посредством системы интернет-банкинга Сбербанк Онлайн.

9.1.2. Совершить 1 (одну) безналичную операцию с использованием кобрендинговой карточки по оплате товаров/работ/услуг, в том числе он-лайн платежи, но за исключением операций, перечисленных в п. 9.5.1 – 9.5.9. Правил, на сумму 10,00 (десять) белорусских рублей и более, а в случае совершения безналичной операции в валюте, отличной от белорусского рубля, на сумму, эквивалентную 10,00 (десяти) белорусским рублям и более по курсу белорусского рубля к соответствующей валюте, установленному Национальным банком Республики Беларусь на дату совершения безналичной операции.

9.1.3. Зарегистрировать совершенную безналичную операцию, указанную в пункте 9.1.2. Правил, на сайте Игры https://www.bps-sberbank.by/Geelygame (далее – «Сайт»), заполнив на русском или белорусском языке регистрационную форму Игры.

9.1.4. Участник может принять участие в Игре только один раз.

9.1.3.1. Регистрационная форма содержит следующие обязательные поля для заполнения:

- фамилия, имя, отчество участника (полностью);
- адрес электронной почты (e-mail) участника (будет использован Организатором при уведомлении участника о выигрыше); номер телефона участника в формате «код оператора, номер абонента» (пример – 29-XXXXXXX, где 29 – код оператора, а XXXXXXX – номер абонента, без пробелов и символов);
- последние шесть цифр номера банковской платежной карты;
- сумма и валюта совершенной безналичной операции;
- дата совершения безналичной операции;
- подтверждение об ознакомлении с Правилами Игры, а также на использование Организатором персональных данных участника для их передачи, проверки и обработки в связи с участием участника в Игре, на получение уведомлений и рекламно-информационных сообщений от Организатора в связи с участием участника в Игре.

9.1.4 Соблюдать правила пользования банковскими платежными карточками.

9.2 Участник Игры должен сохранять до выдачи призов оригинал терминального карт-чека безналичной операции (далее – «чек») либо предоставить выписку по банковскому счету в случае онлайн оплаты либо утери чека.

9.3 Участник получает e-mail-уведомление об участии в Игре в течение 24 часов после уведомления об успешной регистрации участника на Сайте.

9.4. Для розыгрыша приза каждому участнику, выполнившему условия п. 9.1. Правил, присваивается 1 (Один) порядковый номер на основании даты и времени регистрации участника на Сайте, при совпадении даты и времени регистрации участника на Сайте – по фамилии, имени, отчеству участника в алфавитном порядке.

9.5. Не являются основанием для участия в Игре:

9.5.1. совершение безналичных операций по кобрендинговым картам, выданным участникам после 23 часов 59 минут 18.11.2019 года;

9.5.2. безналичные операции, совершенные после 23 часов 59 минут 18.11.2019 года;

9.5.3. безналичные операции на сумму, не соответствующую условиям п. 9.1.2. Правил;

9.5.4. операции по снятию наличных денежных средств или пополнению банковского счета;

9.5.5. операции по переводу денежных средств с одной банковской платежной карточки на другую банковскую платежную карточку;

9.5.6. операции по оплате налогов, государственных пошлин, сборов и иных обязательных платежей;

9.5.7. операции по размещению (пополнению) депозитов, оплате кредитных обязательств и банковских комиссий;

9.5.8. операции по оплате услуг мобильных операторов;

9.5.9. операции, совершенные посредством мобильного и интернет-банкинга.

9.6. Организатор оставляет за собой право проверки данных о достоверности совершенной операции Победителем Игры, в том числе обратиться в Банк в целях проверки зарегистрированной операции в Игре.

10. Порядок проведения розыгрыша призового фонда.

Место проведения розыгрыша приза – г. Борисов, ул. Гагарина, 119, Государственное спортивное учреждение «Борисов-Арена», помещение Пресс-центра.

Всего за период проведения Игры Организатором проводится 1 (один) розыгрыш призового фонда 23.11.2019 г. в 16.00.

Для осуществления розыгрыша Организатор формирует список, в котором присваивает всем участникам Игры номера в хронологическом порядке согласно дате и времени регистрации на Сайте участника, а при совпадении даты регистрации на Сайте участника – по фамилии, имени, отчеству участника в алфавитном порядке (далее – «массив»).

Массив включает в себя порядковые номера участников, фамилию, имя, отчество участника (полностью), адрес электронной почты (e-mail), номер телефона участника, сумма по безналичной операции в белорусских рублях либо в валюте, дата совершения безналичной операции.

10.4. Для определения выигрышного номера для приза Организатор использует лототрон и набор шаров в количестве 10 (десяти) штук с цифрами от 0 (нуля) по 9 (девять).

10.5. Определение выигрышного номера происходит путем его формирования слева направо из цифр в шарах, поочередно извлекаемых из лототрона.

10.6. Для определения цифры первого слева разряда выигрышного номера Организатор помещает в лототрон шары с цифрами от 0 (нуля) до цифры, соответствующей первой слева цифре последнего по порядку номера в массиве. Организатор извлекает из барабана один шар. Цифра из извлеченного шара вносится в протокол и записывается в первый слева разряд формируемого выигрышного номера.

10.7. Далее в лототрон загружаются все 10 (десять) шаров, шары перемешиваются, и из лототрона извлекается шар, цифра в котором определяет цифру следующего разряда выигрышного номера. Производится проверка на наличие полученной комбинации цифр разрядов в соответствующих разрядах номеров массива. При наличии совпадения цифра вытянутого шара записывается в соответствующий разряд выигрышного номера – и шар возвращается в лототрон; в противном случае – извлеченный шар с цифрой не возвращается в лототрон, и Организатор извлекает следующий шар до получения нужного совпадения. Шары извлекаются до тех пор, пока полученная комбинация цифр разрядов не попадает в диапазон цифр соответствующих разрядов номеров в массиве.

10.8. Победитель получает приз – Автомобиль Geely.

10.9 После определения победителя приза для обеспечения полной выдачи призов Организатор осуществляет определение резервного победителя для приза в количестве 1 (одного) человека в порядке, указанном в п.п. 10.4. – 10.7.

11. Срок и способ информирования победителей розыгрыша, место, порядок и сроки вручения призов.

11.1. В сроки, определенные в таблице 2, Организатор уведомляет победителя/резервного победителя о выигрыше по электронной почте, указанной при регистрации в Игре, а также по номеру телефона, указанному при регистрации в Игре, в том числе путем направления SMS-сообщения.

Таблица 2

Сроки уведомления победителя	Сроки выдачи приза	Сроки уведомления резервного победителя	Сроки выдачи приза резервному победителю
По 28.11.2019 г. включительно	По 05.12.2019 г. включительно	По 10.12.2019 г. включительно	По 17.12.2019 г. включительно

11.2. Победитель/резервный победитель может получить выигранный им приз следующим образом:

11.2.1. Путем самовывоза по адресу: г. Борисов, ул. Гагарина, 119, Государственное спортивное учреждение «Борисов-Арена», в сроки, установленные для выдачи призов в Таблице 2 Правил, с 10.00 до 17.00 в рабочие дни и с 10.00 до 13.00 в субботу, предварительно связавшись с Организатором по телефону +375 (29) 196-17-16 или по адресу электронной почты visa@yaskrava.by, и предоставить Организатору лично документ, удостоверяющий личность (паспорт, вид на жительство в Республике Беларусь) для использования данных при оформлении необходимых документов в рамках игры (Ф. И. О., серия и номер паспорта (вида на жительство в Республике Беларусь), дата выдачи, орган, выдавший паспорт (вид на жительство в Республике Беларусь), идентификационный номер, адрес регистрации), а также выписку из банка, подтверждающую совершение по кобрендинговой карточке зарегистрированной в Игре безналичной операции или чек.

11.3. Если победитель не может получить приз лично, приз может получить в установленные сроки (Таблица 2) его законный представитель (доверенное лицо), уведомив об этом Организатора по телефону +375 (29) 196-17-16 или по адресу электронной почты visa@yaskrava.by. При передаче приза доверенное лицо обязано предоставить лично Организатору лично:

- доверенность от победителя на получение приза, заверенную нотариально;
- документ, удостоверяющий личность законного представителя/доверенного лица (паспорт, вид на жительство в Республике Беларусь, иной документ, удостоверяющий личность);
- выписку из банка, подтверждающую совершение по кобрендинговой карточке зарегистрированной в Игре безналичной операции или чек.

11.4. Приз вручается резервному победителю в случае, если основной победитель:

11.4.1. отказывается от получения приза, о чем письменно извещает Организатора;

11.4.2. нарушает (не выполняет) условия Правил, в том числе не предоставляет необходимые подтверждающие документы, указанные в Правилах, в сроки и в порядке, установленные Правилами;

11.4.3. не выходит на связь с Организатором и не является для получения приза в сроки, установленные Правилами (п. 11. Правил);

11.4.4. отказывается от подписания документов, фиксирующих факт выдачи приза, и иных документов, вытекающих из участия в Игре;

11.4.5. если совершенная им безналичная операция, зарегистрированная на Сайте, не соответствует требованиям Правил (например, если участник зарегистрировал сумму транзакции, не совпадающую с суммой в чеке или банковской выписке).

11.5. Приз не подлежит замене. Выплата денежного эквивалента Приза не осуществляется. Ответственность Организатора по выдаче Приза ограничена количеством и видом приза, указанных в Правилах.

11.6. При получении приза победитель/резервный победитель несет все права и обязанности по уплате подоходного налога в бюджет Республики Беларусь. Начисление, удержание и перечисление подоходного налога проводятся в порядке, установленном Особенной частью Налогового кодекса Республики Беларусь и осуществляется Организатором. Удержание с победителя/резервного победителя подоходного налога, исчисленного Организатором в соответствии с законодательством Республики Беларусь, производится Организатором (выступающим в качестве налогового агента) в момент выдачи приза из денежной части приза (денежная часть приза удерживается Организатором для уплаты подоходного налога в установленном размере).

11.7. В случае если и основной, и резервный победители, претендующие на получение приза, не обеспечивают соблюдение условий Правил, в результате чего теряют право получения приза, приз используется согласно распоряжению Организатора.

12. Права и обязанности участников Игры.

12.1. Принимая участие в Игре, участники подтверждают свое ознакомление и согласие со всеми условиями Правил, а также принимают на себя обязательство выполнять все требования Правил и законодательства, вытекающие из участия в Игре и/или связанные с получением приза.

12.2. Участники соглашаются давать рекламные интервью об участии в Игре, в том числе по радио, телевидению, в интернете и в иных средствах массовой информации, а также сниматься для изготовления графических рекламных материалов без уплаты за это какого-либо вознаграждения в рамках данной Игры. Факт участия в Игре подразумевает, что ее участники соглашаются с тем, что в рамках данной Игры их имена, фамилии, отчества, фотографии, аудио и видеоинтервью и иные материалы о них могут быть использованы Организатором и Банком. Все права, в том числе исключительные имущественные права, на такие материалы будут принадлежать Организатору.

13. Наименование печатного издания средства массовой информации для публикации Правил и результатов розыгрыша, сроки публикации.

13.1. Правила Игры подлежат публикации в газете «Звязда» до начала Игры.

13.2. Результаты проведения Игры подлежат публикации в газете «Звязда» не позднее 13.12.2019.

14.Общие положения.

14.1. Решения Организатора по всем вопросам, связанным с проведением Игры, а также результаты проведения Игры, будут считаться окончательными и распространяться на всех участников.

14.2. Компания Visa и любые ее аффилированные лица, Заинтересованное лицо и любые его аффилированные лица, как и Банк и любые его аффилированные лица (за исключением лиц, входящих в состав Комиссии по проведению Игры), не являются Организатором, не принимают участия в розыгрыше, а также определении победителей, за исключением лиц, входящих в состав Комиссии по проведению Игры, не несут ответственности за соблюдение Организатором Правил, законодательства Республики Беларусь, а также не отвечают по претензиям участников Игры.

14.3. Организатор не несет ответственность, если не по его вине у участника отсутствует доступ к сети интернет при ее использовании Участником (например, за работу компаний, предоставляющих услуги сети интернет), электронной почте, за работу операторов сотовой подвижной электросвязи (плохое соединение с участником и т.д.). Организатор не компенсирует участнику расходы, связанные с оплатой транспортных расходов при посещении офиса Организатора.

14.4. Информацию об условиях участия и проведения Игры можно получить по телефону «горячей линии» +375 (29) 196-17-16 с 10.00 до 18.00 в рабочие дни и с 11.00 по 14.00 в выходные дни, по электронной почте visa@yaskrava.by.

Свидетельство № 3617 о государственной регистрации рекламной игры выдано 14 августа 2019 г. Министерством антимонопольного регулирования и торговли Республики Беларусь.

ИЗВЕЩЕНИЕ
о проведении аукциона на право заключения договора аренды земельного участка в городе Быхове Могилевской области

№ лота	Месторасположение земельного участка	Кадастровый номер	Площадь земельного участка, га	Правовой режим	Срок аренды, лет	Целевое назначение земельного участка (назначения земельного участка в соответствии с единой классификацией)	Начальная цена объекта, руб.	Сумма задатка, руб.
1	Могилевская область, г. Быхов	721350100002001173	0,2072	Аренда	10	Для строительства и обслуживания площадки для складирования круглых лесоматериалов и изготовления щепы топливной (земельный участок для размещения объектов иного назначения)	2 578,40	257,84

Аукцион состоится 17 сентября 2019 г. в 15.00. по адресу: Могилевская область, город Быхов, ул. Ленина, 37 (зал заседаний). Аукцион проводится в месте, день и час, указанные в извещении о проведении аукциона. Условие проведения аукциона — наличие не менее двух участников аукциона на лот.

Заявки принимаются с 19.08.2019 г. по 13.09.2019 г. включительно по адресу: Могилевская обл., г.Быхов, ул. Ленина, 37, кабинет 30, в рабочие дни с 8.00 до 17.00, обед с 13.00 до 14.00. Контактные телефоны 8 (02231) 79708, 78897.

Всем желающим предоставляется возможность предварительно ознакомиться на местности с земельным участком.

Для участия гражданину, индивидуальному предпринимателю или юридическому лицу (лично либо через своего представителя или уполномоченное должностное лицо) в установленный в извещении срок необходимо: а) подать заявление об участии в аукционе; б) предоставить документ с отметкой банка, подтверждающий внесение суммы задатка на расчетный счет Быховского райисполкома BY67 AKBB 3641 0456 7038 3700 0000 в АСБ «Беларусбанк» филиал № 700 г. Могилев, код банка AKBBBY21700, код платежа 04002, УНП 700085027; в) заключить с Быховским районным исполнительным комитетом соглашение о правах, обязанностях и ответственности сторон в процессе подготовки и проведения аукциона. Кроме того, в комиссию представляются:

гражданином – копия документа, содержащего его идентификационные сведения без нотариального засвидетельствования;

индивидуальным предпринимателем – копия свидетельства о государственной регистрации индивидуального предпринимателя без нотариального засвидетельствования;

представителем гражданина или индивидуального предпринимателя – нотариально удостоверенная доверенность;

представителем или уполномоченным должностным лицом юридического лица Республики Беларусь – доверенность, выданная юридическим лицом, или документ, подтверждающий полномочия должностного лица, копии документов, подтверждающих государственную регистрацию юридического лица без нотариального засвидетельствования, документ с указанием банковских реквизитов юридического лица;

представителем или уполномоченным должностным лицом иностранного юридического лица – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть произведена в течение года до подачи заявления на участие в аукционе) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский или русский язык, легализованные в установленном порядке доверенность или документ, подтверждающий полномочия должностного лица, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский или русский язык;

представителем иностранного гражданина – легализованная в установленном порядке доверенность, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский или русский язык.

Консолидированными участниками для участия в аукционе представляются также оригинал и копия договора о совместном участии в аукционе.

При подаче документов на участие в аукционе граждане, представители граждан, индивидуальных предпринимателей и юридических лиц, уполномоченные должностные лица юридических лиц предъявляют документ, удостоверяющий личность. При подаче документов уполномоченное лицо (его представитель) предъявляет документ, удостоверяющий личность, и доверенности, выданные гражданами, индивидуальными предпринимателями, юридическими лицами, заключившими договор о совместном участии в аукционе. Представителем уполномоченного лица дополнительно предъявляется доверенность, выданная в установленном законодательством порядке, либо документ, подтверждающий полномочия должностного лица.

К участию в аукционе допускаются лица, подавшие в комиссию в указанные в извещении сроки соответствующее заявление с приложением необходимых документов и внесшие задаток в размере, порядке и сроки, определенные в извещении о проведении аукциона, а также заключившие соглашение.

Условия предоставления земельного участка победителю аукциона либо единственному участнику несоотвшегося аукциона:

- внести в течение 10 рабочих дней со дня утверждения в установленном порядке протокола о результатах аукциона: внести плату за право заключения договора аренды земельного участка (часть платы – в случае предоставления рассрочки ее внесения) за вычетом суммы задатка на расчетный счет Быховского районного исполнительного комитета BY67 AKBB 3641 0456 7038 3700 0000 в АСБ «Беларусбанк» филиал № 700 г. Могилев, код банка AKBBBY21700, код платежа 04002, УНП 700085027; возместить затраты на организацию и проведение аукциона, в том числе расходы, связанные с изготовлением и предоставлением участникам документации, необходимой для его проведения на расчетный счет Быховского районного исполнительного комитета BY67 AKBB 3641 0456 7038 3700 0000 в АСБ «Беларусбанк» филиал № 700 г. Могилев, код банка AKBBBY21700, код платежа 04616, УНП 700085027 в сумме – 2724,93 руб.;
- не позднее 2 рабочих дней после совершения вышеуказанных действий, заключить с Быховским районным исполнительным комитетом договор аренды земельного участка;
- обратиться за государственной регистрацией в отношении земельного участка в двухмесячный срок со дня подписания договора аренды земельного участка;
- обратиться за государственной регистрацией прекращения права землепользователя на земельный участок;
- получить в установленном порядке разрешение Быховского районного исполнительного комитета на проведение проектно-изыскательских работ и разработку строительного проекта на строительство объекта в срок, не превышающий двух лет;
- приступить к строительству объекта в течение шести месяцев со дня утверждения в установленном порядке проектной документации на строительство такого объекта;
- снять на занимаемом земельном участке плодородный слой почвы и использовать его согласно строительному проекту;
- до занятия земельного участка осуществлять работы по наведению порядка на предоставленном земельном участке и его благоустройству в соответствии с требованиями земельного законодательства;
- обеспечить использование земельного участка в соответствии с целевым назначением.

Условия инженерного развития инфраструктуры застраиваемой территории – индивидуальный проект.

Быховский районный исполнительный комитет

НА ВАЙНЕ ЯК НА ВАЙНЕ

Як развіваецца глабальнае супрацьстаянне ЗША і Кітая?

ЗША зрабілі новы крок у гандлёвай вайне з Кітаем. Адміністрацыя Дональда Трампа прыпыніла выдачу ліцэнзій на аднаўленне работы з Huawei. Кітайская карпарацыя знаходзіцца пад санкцыямі з мая. Крыніцы агенцтва Bloomberg звязваюць гэта з тым, што Паднябесная прыпыніла закупкі амерыканскай сельскагаспадарчай прадукцыі. Супярэчнасці ў адносінах паміж Вашынгтонам і Пекінам абвастраюцца, і іх можна смела называць гандлёвай вайной — так лічыць большасць амерыканскіх экспертаў, якіх апытаў The Wall Street Journal. Год таму аналітыкі прытрымліваліся больш асцярожнай рыторыкі. Як развіваецца супрацьстаянне ЗША і Кітая?

Долар VS юань

Гандлёвая вайна з Кітаем рэзка абвастрылася ў жніўні, пасля таго як на мінулым тыдні, упершыню з 1994 года, Вашынгтон назваў Пекін валютным маніпулятарам. Акрамя таго, ЗША заявілі, што ўвядуць 10-працэнтныя пошліны на астатнюю частку кітайскага імпарту аб'ёмам 300 мільярдаў долараў з 1 верасня. Гэтыя крокі выклікалі ўзрушэнне на фінансавых рынках і ўзмацнілі апасенні глабальнай рэцэсіі. Усяго за адзін дзень 500 самых багатых людзей у свеце страцілі $117 млрд, піша Bloomberg. У сукупнасці іх страты склалі звыш двух працэнтаў чыстага капіталу. Мяркуючы па звестках індэкса мільярдэраў (Bloomberg Billionaires Index), у найбольшым «мінусе» аказаўся заснавальнік Amazon Джэф Безас, ён жа самы багаты чалавек на планеце, — $3,43 млрд.

«Інвестараў больш за ўсё турбуе перспектыва таго, што гандлёвая вайна паміж ЗША і Кітаем перарасце ў валютную», — адзначыла эканаміст з Гарвардскага ўніверсітэта Меган Грын. Валютныя войны не абяцаюць свету нічога добрага, таму што дэвальвацыя дзеля скарачэння гандлёвых перакосаў звычайна прыводзіць да невялікага павелічэння экспарту, але адначасова стрымлівае ўнутранае спажыванне з прычыны падаражання імпарту. Гэта вядзе да інфляцыі, павышэння ставак крэдытаў і запаволення эканамічнага росту. Апошнюю валютную вайну свет перажыў у гады фінансавага крызісу дзесяцігадовай даўніны. Тады цэнтрабанкі навыперадкі зніжалі стаўкі, і інвестары ў пошуку даходных інструментаў скуплялі актывы краін, якія развіваюцца. Гэта павышала попыт на іх валюту, падымала яе курс і рабіла тавары і паслугі неканкурэнтаздольнымі на сусветным рынку, што ў выніку прыводзіла да падзення эканомікі.

Гэтым разам ЗША вырашылі, што Кітай спецыяльна заніжае курс юаня, пасля таго як ён апусціўся ніжэй за важную псіхалагічную мяжу ў 7,0 за долар і апынуўся на самай нізкай адзнацы за дзесяцігоддзе. У адказ мінфін ЗША ўпершыню за чвэрць стагоддзя ўнёс Кітай у спіс краін, якія праводзяць маніпуляцыі валютнымі курсамі, хоць яшчэ ў маі прызнаваў, што Пекін не робіць гэтага. Міжнародны валютны фонд, са свайго боку, упэўнены, што курс юаня знаходзіцца на фундаментальна абгрунтаваным узроўні. А вось долар, па ацэнцы Bank of America, цяпер пераацэнены прыблізна на 13 працэнтаў.

Твіты Трампа

Трамп не стамляецца кідаць твіты ў бок незалежнага цэнтрабанка, дамагаючыся патаннення крэдытаў і накачкі эканомікі танны-мі грашыма, лічаць эксперты. Гэта адзін са спосабаў аслабіць валютны курс, таму што зніжэнне ставак ФРС скарачае прыбытковасць амерыканскіх актываў, чым зніжае попыт на долары. Аднак у апошнія гады сітуацыя была зваротная: ФРС праводзіў больш жорсткую палітыку, у той час як цэнтрабанкі па ўсім свеце, наадварот, трымалі стаўкі блізкімі да нуля. У выніку тыя, хто хацеў зберагчы, напрыклад, еўра, іены, фунты ці франкі ад інфляцыі, куплялі на іх долары, каб укласці ў амерыканскія каштоўныя паперы. ФРС у выніку адмовілася ад далейшага павышэння ставак і нават трохі знізіла кошт крэдытаў, але не таму, што гэтага патрабаваў Трамп, а таму, што яго гандлёвыя войны паставілі пад пагрозу эканамічны рост. Услед за амерыканскім цэнтрабанкам рушылі іншыя. «Мы сталі сведкамі агрэсіўнага зніжэння ставак цэнтрабанкамі Новай Зеландыі, Індыі і Тайланда», — адзначыла Меган Грын. Вынікам могуць стаць «запаволенне эканамічнага росту, высокая інфляцыя і дзікая валацільнасць на валютным рынку».

Прэзідэнт Дональд Трамп заявіў, што яго жорсткая пазіцыя ў дачыненні да эканамічнай і гандлёвай палітыкі Кітая ў канчатковым выніку прынясе карысць амерыканскай эканоміцы, нягледзячы на тое што Пекін даў зразумець, што можа нанесці зваротны ўдар, абмежаваўшы продаж рэдказямельных элементаў, якія маюць вельмі шырокае прымяненне — ад iPhone да ваеннай тэхнікі. Трамп заўважыў журналістам у Белым доме, што рэакцыя рынку была чаканай, але ён па-ранейшаму ўпэўнены ў трываласці амерыканскай эканомікі. «У рэшце рэшт яна падымецца нашмат вышэй, чым калі-небудзь, таму што Кітай цягнуў нас уніз, як якар. Кітай забіваў нас несправядлівымі гандлёвымі пагадненнямі», — сказаў амерыканскі лідар.

КНР і ЗША на працягу некалькіх месяцаў вялі перагаворы аб урэгуляванні гандлёвых спрэчак. Апошні, дванаццаты іх раўнд прайшоў у Шанхаі ў прыканцы ліпеня. Белы дом назваў сустрэчы канструктыўнымі і пацвердзіў, што наступныя перагаворы, як чакаецца, пройдуць у Вашынгтоне ў пачатку верасня. Супрацоўнікі адміністрацыі заявілі, што яны ўсё яшчэ спадзяюцца на тое, што новых пошлін яшчэ можна пазбегнуць, калі дзве найбуйнейшыя эканомікі свету дасягнуць прагрэсу па гандлёвым пагадненні.

Але надзеі на глабальную здзелку слабеюць, кампанія Goldman Sachs заявіла, што больш не разлічвае на тое, што ЗША і Кітай дасягнуць пагаднення да прэзідэнцкіх выбараў у лістападзе 2020 года, улічваючы «жорсткую лінію», якую праводзяць абодва бакі. Амерыканскія кампаніі і спажыўцы ў чэрвені заплацілі пошліны на суму 6 мільярдаў долараў, што на 74 працэнты больш, чым за той жа перыяд летась. Пра гэта паведамілі кааліцыя амерыканскіх гандлёвых арганізацый, папярэдзіўшы, што новыя пошліны прывядуць да страты працоўных месцаў і зніжэння спажывецкага попыту.

Стаўка на «крыпту»

Агенцтва Reuters папярэджвае: эскалацыя гандлёвай вайны падштурхоўвае ЗША да рэцэсіі. Апытаныя выданнем эканамісты ацэньваюць верагоднасць спаду амерыканскай эканомікі на працягу двух гадоў у 45 працэнтаў. Абвастрэнне міжнароднай напружанасці ў гандлі і павышэнне тарыфаў павялічвае выдаткі, разбурае ланцужкі паставак і памяншае прыбытковасць кампаній. Гэта, у сваю чаргу, уплывае на спажывецкія настроі, а падзенне выдаткаў ставіць эканоміку на мяжу рэцэсіі. Але самыя вялікія апасенні выклікаюць дзеянні прэзідэнта ЗША Дональда Трампа: ніхто не разумее, на што яшчэ ён гатовы пайсці, каб прымусіць Кітай сесці за стол перагавораў.

Як адзначаюць эксперты, ЗША чарговы раз за апошнія 10 гадоў ператварыліся з рухавіка росту сусветнай эканомікі ў крыніцу яе галоўных праблем: гандлёвы канфлікт з Кітаем, паводле многіх ацэнак, у тым ліку Міжнароднага валютнага фонду, становіцца адной з галоўных прычын запаволення тэмпаў росту сусветнай эканомікі.

Інвестары бягуць з рызыкоўных актываў, піша Financial Times. Яны канфіскавалі дзясяткі мільярдаў долараў з акцый і высокадаходных аблігацый. Чым далей заходзіць гандлёвая вайна ЗША з Кітаем, тым больш запавольваюцца вядучыя сусветныя рынкі, і крэдыторы нервуюцца. У сваю чаргу, пераход капіталу ў цікія гавані не спрыяе эканамічнаму росту і дадаткова тармозіць рынкі. Звычайна ў падобных сітуацыях палахлівыя інвестары выводзяць свае грошы з акцый і з рынку валют у такія стабільныя актывы, як золата і (у меншай ступені) нерухомасць. Аднак цяпер усё інакш — капіталы хлынулі ў крыптавалюты, перш за ўсё ў біткойн, рынечная капіталізацыя якога перавысіла 200 мільярдаў долараў.

Кітайская прэса глядзіць на сітуацыю больш аптымістычна. Як піша South China Morning Post, гандлёвая вайна, вядома, істотна псуе настрой інвестараў і цісне на рынкі. Аднак прыкмет поўнамаштабнага фінансавага крызісу не відаць. Пра гэта сведчыць, напрыклад, гатоўнасць зніжаць стаўку ФРС. Да таго ж у аснове нервовасці рынкаў ляжыць нявызначанасць, а не дрэннае макраэканамічнае становішча. Нарэшце, у South China Morning Post не выключаюць сумненняў здольнасць Кітая забяспечыць устойлівасць сваёй валюты.

Козыр у рукаве

Цяперашняя сітуацыя «можа стаць пачаткам незваротнага гандлёвага канфлікту паміж двума краінамі», апасаецца дырэктар Нямецкага інстытута эканамічных даследаванняў (DIW) у Берліне Марсэль Фрацшэр. Асобныя амерыканскія выданні, у прыватнасці New York Times, наўпрост параўноўваюць цяперашнюю рэцэсію з сітуацыяй напярэдадні 2008 года. Найбуйнейшы замежны крэдытор амерыканскай эканомікі, Кітай, здольны пусціць у ход галоўную зброю — распродаж амерыканскіх дзяржаблігацый. Гэты сцэнарый звычайна разглядалі як нерэалістычны, піша Bloomberg. Хоць бы таму, што з паперамі больш чым на трыльён долараў знайсці альтэрнатывы для інвеставання — задача не з лёгкіх. Аднак рэзкае паслабленне кітайскай валюты відавочна паказвае на тое, што такі варыянт не выключаецца.

«Кітай валодае шырокім арсеналам сродкаў, акрамя таго, Пекін дзейнічае на больш доўгатэрміновую перспектыву, чым прэзідэнт ЗША Дональд Трамп», — лічыць прафесар Ельскага ўніверсітэта і экс-старшыня савета дырэктараў Morgan Stanley Asia Стывен Роўч. Па яго словах, ужыўшы ў якасці зброі ўласную валюту, кітайцы цалкам могуць разгледзець і «іншыя опцыі» — у прыватнасці, скараціць укладанні ў казначэйскія паперы. І гэта ўжо адбываецца. З пікавага значэння ў 1,3 трыльёна долараў у 2013 годзе інвестыцыі ў амерыканскі дзярждоўг зменшыліся на 200 мільярдаў, да двухгадовага мінімуму — 1,11 трыльёна долараў. Калі Кітай раптам распачне маштабны распродаж, наступствы будуць катастрафічныя. Масавы скід трэжэрыс абваліць іх кошт, што выкліча паніку на рынку аблігацый і падзенне курсу долара.

«Нават сімвалічная дэвальвацыя юаня прыводзіць да падзення фондавага рынку ЗША», — такое меркаванне выказаў амерыканскі эканаміст, лаўрэат Нобелеўскай прэміі Пол Кругман у сваім артыкуле для газеты New York Times. На яго думку, асобныя амерыканцы «пераацэньваюць свае здольнасці ў прычыненні шкоды Кітаю і недаацэньваюць здольнасці КНР». Кругман лічыць, што да цяперашняга часу дзеянні Паднябеснай былі «адносна памяркоўныя», больш падобныя на выкладанне эканомікі для некаторых амерыканцаў.

Два спісы

Днямі стала вядома, што Трамп паддаўся на ціск амерыканскага бізнесу і апасенні наступстваў поўнамаштабнай гандлёвай вайны з Кітаем і адклаў увядзенне новых мытных тарыфаў на шэраг тавараў з Паднябеснай да сярэдзіны снежня. Эканамісты вітаюць рашэнне Белага дома, але падкрэсліваюць, што ні пра які мір гаворкі не ідзе, хоць кансультацыі і, магчыма, перагаворы працягнуцца. Амерыканскі прэзідэнт проста націснуў на кнопку «паўза» і перанёс пачатак буйных непрыемнасцяў на 15 снежня, даўшы планеце трохмесячную перадышку, адзначае expert.ru.

Перанос тарыфаў на пазнейшую дату асвяжыў рынкі, якія ўсё мацней нерваваліся напярэдадні ўвядзення новых тарыфаў. Акцыі амерыканскіх кампаній спынілі двухдзённае падзенне, а азіяцкіх — нават пайшлі ўверх. Дональд Трамп патлумачыў сваё рашэнне тым, што апошнія зносіны з Кітаем былі прадуктыўнымі і што «яны (кітайцы) на самай справе хочуць заключыць пагадненне». Раней прэзідэнт ЗША неаднойчы сцвярджаў, што тарыфы ніяк не ўплываюць на цэны для амерыканцаў і што ўсе страты нясе кітайскі бок. Аднак цяпер ён дадаў, што адклаў увядзенне тарыфаў, каб не перашкаджаць падрыхтоўцы да Каляд і сезону масавых пакупак.

Белы дом падзяліў кітайскія тавары амаль на 300 мільярдаў долараў на дзве групы. Сельгаспрадукты, антыкварыят, адзенне і абутак, посуд і некаторыя іншыя пазіцыі на 110 мільярдаў долараў застаюцца ў спісе тавараў, тарыфы на якія будуць уведзены з 1 верасня. Такія тавары, як смартфоны, лэптопы і дзіцячыя цацкі, агульным коштам прыблізна на 160 мільярдаў долараў трапілі ў спіс прадукцыі, тарыфы на якую будуць уведзены 15 снежня. Шэраг тавараў, у тым ліку Біблії і грузавыя кантэйнеры, агульным коштам каля 2 мільярдаў долараў наогул выведзены з тарыфных спісаў.

Захар БУРАК.

Дзмітрый НАБОКАЎ:

«У мяне ёсць толькі вышыня»

Што прыносяць спартсменам рэкорды, і як хутка яны змагаюцца з сур'ёзнымі траўмамі

Ураджэнец Бялыніч Дзмітрый Набокаў стаў сярэбраным прызёрам юніёрскага чэмпіянату свету ў 2015-м, праз два гады заваяваў званне чэмпіёна Еўропы сярод моладзі, а ў 2018-м пабіў рэкорд Беларусі, які трымаўся 25 гадоў і быў усталяваны яшчэ Андрэем Санковічам у 1993 годзе. Раней да адзнакі 2,34 у скачках у вышыню ніхто з беларусаў нават і не набліжаўся, а Дзмітрый Набокаў на рэспубліканскай Універсіядзе ў Брэсце скокнуў 2,36. Калі б такі вынік ён паказаў на чэмпіянаце свету ці Алімпійскіх гульнях, то дакладна трапіў бы на п'едэстал. Напрыклад, з вынікам 2,36 катарац Мутаз Эса Баршым быў другі на Алімпійскіх гульнях 2016 года, а ў 2018-м пераможца чэмпіянату Еўропы немец Матэуш Пжыбілка ў сваёй найлепшай спробе паказаў 2,35.

Аднак той скачок Дзімы застаўся ў мінулым, пасля гэтага малады спартсмен атрымаў сур'ёзную траўму і быў вымушаны спыніць выступленні. Цяпер пасля аперацыі і аднаўлення скакун вяртаецца да спаборніцтваў — сёння Дзмітрый уваходзіць у склад зборнай Еўропы на матчавую сустрэчу з ЗША. Пра тое, як праходзіла яго выздараўленне, колькі спартсмен скача на трэніроўках і чаму траціць за некалькі гадзін два кілаграмы, Дзмітрый расказаў чытачам «Звязды».

«Цяпер я скачу нават лепш, чым раней»

— Дзмітрый, як сябе адчуваеце, пасля аднаўлення прайшло зусім няшмат часу?

— Нармальна. Пасля самалёта ногі зацяклі, былі болевыя адчуванні ў вобласці шва, трошкі балюча скакаць, але нічога. Да матчавай сустрэчы Еўропа — ЗША правяду яшчэ тры старты: у Люксембургу, Мадрыдзе, выступлю на чэмпіянаце краіны ці паеду ў Берлін.

— З часам вы высветлілі прычыны сур'ёзнай траўмы штуршковай нагі. Гэта стомленасць ці няправільна складзены графік?

— Гэта не справа аднаго, двух месяцаў, да гэтага ўсё ішло некалькі гадоў. Нага пачала турбаваць, калі на ёй утварыўся вялікі нарост. Мабыць, ён дасягнуў нейкага крытычнага пункта і пачаў балець, ад гэтага я не мог скакаць. Нага, можа, і раней балела, але я не звяртаў на гэта ўвагу. У адзін дзень усё стала значна горш, з трэнерам паехалі ў Маскву, дзе сказалі, што нарост сам не пройдзе.

— Вам не адразу паставілі правільны дыягназ, гэта зацягнула час...

— Біць у званы мы пачалі ў ліпені, жніўні, усё гэта доўжылася да зімы, па МРТ былі нейкія паляпшэнні. Пачынаў скакаць з пяці крокаў, усё нармальна, а вось з поўнага разгону, сямі крокаў, скакаць было балюча. Я нават выйшаў выступаць на Калядныя старты ў Мінску, але ведаў, што шмат там не скокну, на гэтым зімовы сезон скончыўся, а 1 лютага мне зрабілі аперацыю. Першы раз пасля яе я выступіў толькі пару тыдняў таму на Кубку краіны.

— Што самае складанае было ў гэтым няпростым перыядзе?

— Псіхалагічна, вядома, ціснула, але я не магу сказаць, што думаў пра штосьці, тыпу, скончыць са спортам або перайсці ў іншы від. Ёсць мэты, якія я праследую, ні пра што іншае не думаю. У мяне ёсць піраміда, вяршыня — гэта спорт. Для мяне ёсць толькі вышыня і толькі спорт, а потым ужо ўсё астатняе. Я ведаў, што буду скакаць, не страчу нічога, так яно і атрымалася. Вядома, складана было аднаўляцца, атрымлівацца стала ўсё не адразу, трэба было папрацаваць, але працаваць шмат мне не прывыкаць. Да гэтага часу я не магу сказаць, што скачу без дыскамфорту, ён ёсць, часам нага нават баліць, але гэта павінна прайсці. Пасля аперацыі я стаў доўга расскоквацца, асабліва на трэніроўках. Спроб сем-восем раблю проста пачварна і толькі на адзінаццаты-дванаццаты раз магу нешта скочыць. Наогул здзіўлены, як я скачу на спаборніцтвах, на камандным чэмпіянаце Еўропы не сапсаваў ніводнай спробы. Але ў цэлым цяпер я скачу нават лепш, чым раней.

— Хто быў побач у гэты перыяд?

— Федэрацыя лёгкай атлетыкі не забывала ні на дзень, была аплачана аперацыя, дзякуй вялікі, у тым ліку асабіста Вадзіму Дзевятоўскаму, ён вельмі шмат робіць для нас. Трэнер Уладзімір Фамічоў увесь гэты час быў побач са мной, дамаўляўся з урачамі, ездзіў са мной у Маскву.

«Галоўнае — не абняславіцца, бо я гэта ўмею»

— Вы трапілі ў склад зборнай Еўропы на матчавую сустрэчу, што скажаце пра гэты турнір?

— Для краіны гэта добрая папулярызацыя лёгкай атлетыкі. Я спадзяюся, людзі прыйдуць на стадыён «Дынама», хоць у нас і не вельмі гэта папулярна. Здаецца, не ўсе ведаюць, хто такія Арзамасава, Талай, Герман або Недасекаў, гэта ж не футбол. У Берліне на чэмпіянат краіны прыйшло 60 тысяч гледачоў, вось там папулярызаваць ужо нічога не трэба. У нас на Еўрапейскіх гульнях балельшчыкі на трыбунах, вядома, былі, але, думаю, на матчавай сустрэчы карціна будзе яшчэ лепшая, у першую чаргу з-за імёнаў, якія туды прыязджаюць, усё ж такі гэта самыя моцныя людзі Еўропы. Ды і самі спаборніцтвы цікавыя. Цікавы будзе нават той факт, хто выйграе першы падобны турнір.

Для мяне асабіста пападанне ў зборную Еўропы — вельмі прыемны факт. Паскакаць дома, паспрабаваць паказаць класны вынік. Галоўнае — не абняславіцца, бо я гэта ўмею. Канкурэнцыя будзе высокая, людзей будзе шмат, прызавыя добрыя, стадыён выдатны. Будзем рыхтавацца.

— Пасля матчавай сустрэчы будзе яшчэ адзін важны старт — чэмпіянат свету, плануеце там выступаць?

— Адназначна! Ніколі не быў на чэмпіянатах свету. Так атрымалася, што я позна пачаў сезон, пакуль выступіў толькі на трох турнірах, таму гатовы скакаць кожны тыдзень.

— Ці задаволеныя сваімі вынікамі на гэтых трох стартах?

— Складана быць задаволеным скачком на 2,18, я ехаў перамагаць. Мне было ўсё роўна, колькі я скокну, галоўнае — выйграць, але не атрымалася. У тым, што я скокнуў няшмат, няма нічога страшнага, пакуль яшчэ ёсць нюансы. У надвор'е, якое было на камандным чэмпіянаце Еўропы ў Санэсе, складана паказваць высокі вынік. На спробе з вышынёй 2,21 у мяне трохі паехала нага, было балюча, пасля аперацыі псіхалагічна гэты факт ціснe — раптам зноў што-небудзь здарыцца.

«Вядома, складана было аднаўляцца, атрымлівацца стала ўсё не адразу, трэба было папрацаваць, але працаваць шмат мне не прывыкаць».

— Матчавая сустрэча ўваходзіла ў вашы планы пры падрыхтоўцы да чэмпіянату свету?

— Планаў асаблівых не было, таму што аперацыю мне зрабілі ў лютым, я не ведаў у прынцыпе, калі змагу скакаць і як доўга зацягнецца аднаўленне. Стан дазваляў, значыць, скакалі на трэніроўках. З'явілася магчымасць выступіць на Кубку краіны, вырашылі паспрабаваць, скокнуў там 2,28, далей у Мінску пераадолеў 2,30. На той рабоце, што мы робім, я магу скакаць і да лістапада, і да снежня. Нават нягледзячы на аперацыю і на тое, што было ўпушчана шмат часу, я стаў скакаць лепш, разумею, што ўжо гатовы скакаць вышэй, чым рабіў гэта год таму. Галоўнае — трапіць у добры стан і надвор'е.

«Адзін чалавек на від — гэта агідна»

— Доўгі час ваша імя ў першую чаргу было звязана з 25-гадовым рэкордам краіны, які вы пабілі. Як ставіцеся да гэтага цяпер?

— Абсалютна ніяк. Так, малайчына! Так, высока! Але трэба скокнуць яшчэ вышэй. Рэкорд краіны — гэта прыемны бонус, але на гэтым усё скончылася. У цябе 2,36, а ў Берлін на чэмпіянат свету ты едзеш гледачом. У цябе 2,36, а вялікі кантракт, умоўна кажучы, NIKE не дае, таму што гэты вынік быў паказаны ў нас у Брэсце на нейкім незразумелым старце ў нейкі незразумелы час. Я атрымаў за гэты рэкорд 700 рублёў, а скокнуў бы на Брыльянтавай лізе — атрымаў бы 10 тысяч долараў. Хоць добра скакаць трэба ўсюды. У нас жа не лягчэй скакаць, чым у Іспаніі ці Германіі. Сукупнасць фактараў склалася так, што добра скокнуў менавіта там, але я ведаю, што магу больш. Скачкі там і тут адрозніваюцца тваім фінансавым становішчам.

— Канкурэнцыя з беларусам Максімам Недасекавым — гэта плюс для вас ці мінус?

— З пункту гледжання выніку канкурэнцыя, безумоўна, важная, і што ў нас яна ёсць — добра, мы адзін аднаго падганяем. У нас у краіне можна скокнуць 2,32 і застацца другім, хоць, здавалася б, гэта прызы чэмпіянату свету і Алімпіяды. Але з іншага боку, калі б ты быў адзін, то інакш бы да цябе ставіліся, бераглі. Але адзін чалавек на від — гэта агідна.

— Якую максімальную вышыню вы бралі?

— У гэтым сезоне 2,24. Калі на трэніроўцы я скачу за 2,20, то разумею, што знаходжуся ў добрай форме і на спаборніцтвах магу скокнуць за 2,30. Але на трэніроўках стаўлю планку максімум на 2,25, таму што не магу рабіць тое ж самае на трэніроўках і на спаборніцтвах.

— Ёсць канкрэтная лічба, якую вы хацелі б скарыць?

— Нельга загадваць. Вядома, першае, што прыходзіць на розум, — 2,37: хочацца пабіць асабісты рэкорд. Перадумовы да гэтага бачныя, але не зразумела, як павядуць сябе ногі, якое будзе надвор'е. Усё павінна скласціся. Каб вага была добрая, не менш і не больш. Бывае, мне яе не хапае.

— Вага спартсмена мае вялікае значэнне ў скачках у вышыню?

— За ўсіх казаць не буду, але асабіста для мяне так. Я сачу за гэтым аспектам. Калі што, пачынаю абмяжоўваць сябе ў харчаванні, салодкае не ем, цукар таксама. Ідэальная скачковая вага для мяне 68 кг, 69,5 кг пры росце 187 см. Пасля каманднага чэмпіянату Еўропы ўстаў на шалі — 66,6 кг. Гэта ўжо мала. Падчас спаборніцтваў адчуваў сябе дрэнна, на вуліцы холадна, а мне горача, скура гарыць. Прыходжу дадому, думаю, у чым справа? Сто працэнтаў скінуў вагу. Выходзіў на спаборніцтвы — важыў 68,6 кг, прыйшоў — 66,6 кг. За некалькі гадзін схуднеў на два кілаграмы. Хвалююся, скачу, калорыі спальваюцца. Адчуваў, што не хапае грамаў 700 дакладна, ад гэтага хутка сканчаюцца сілы.

— Калі казаць у цэлым аб канкурэнцыі ў вашым відзе спорту, яна вялікая?

— Хапае дарослых спартсменаў, падцягваюцца і маладыя, людзей у нас шмат, можна скокнуць 2,38 і стаць пятым. Ёсць чалавек, трэніруецца ў Яўгена Пятровіча Загарулькі, Міша Акімаў, выступаць яго не дапускаюць, але хлопец адзін з наймацнейшых у свеце. Выйграў чэмпіянат Расіі, блізкі да меткі 2,36. Ёсць Ілья Іванюк, які скача 2,33 і праводзіць гэты сезон досыць роўна. Наш Максім Недасекаў, які, я лічу, на матчавай сустрэчы без праблем можа пабіць свой асабісты рэкорд. Малады хлопец з Італіі цяпер скокнуў 2,33 у сябе на чэмпіянаце краіны. Аднаўляецца Мутаз Эса Баршым.

Запрашальнік

Найлепшыя грацыі зноў у Мінску

Этап Кубка свету БСБ Банк па мастацкай гімнастыцы гэтым разам прымае новы Палац гэтага віду спорту

Арганізатары адзначаюць, што змянілася пляцоўка, але не мяняецца тое, што ўжо стала візітнай карткай спаборніцтваў у Беларусі: прадстаўнічы склад удзельніц, добрая арганізацыя і добразычлівая атмасфера. З 16 да 18 жніўня ў Мінску выступяць 230 гімнастак з 36 краін.

Беларусь прадстаўляюць Кацярына Галкіна, Анастасія Салас і каманда ў групавых практыкаваннях — Анастасія Рыбакова, Карына Ярмоленка, Арына Цыцыліна, Ганна Швайба, Ганна Гайдукевіч і Арына Сушчынская. Акрамя беларусак за ўзнагароды Кубка свету БСБ Банк змагаюцца многія зорныя гімнасткі. Сярод іх шматразовыя чэмпіёнкі свету расіянкі Дзіна і Арына Аверыны, двухразовая чэмпіёнка II Еўрапейскіх гульняў, прызёр чэмпіянатаў свету, пераможца шматбор'я мінулага чэмпіянаце свету ў Бангкоку, напрыклад, шлях ад гасцініцы да месца правядзення баёў быў доўгі, ды і самі ўмовы — складаныя. Побач — рынак, чад ад якога перашкаджаў спартсменам. Былі пытанні па харчаванні: арганізатары прапанавалі толькі тайскую кухню, а яна вельмі своеасаблівая. У Мінску ж мы пастараемся зрабіць так, каб усім было камфортна. Падчас чэмпіянату свету ў 2017 годзе ўдзельнікаў вазілі на «Лінію Сталіна». Спадабалася нават індусам, якіх шакіраваў нечаканы снег. Цяпер таксама прыдумаем якую-небудзь цікавую праграму», — адзначыў Караеў.

Плануецца, што ўдзел у кантынентальным форуме возьмуць атлеты больш чым з 35 краін.

«Кожная спартсменка, прыходзячы ў залу, разумее, што яе найвышэйшая мэта — Алімпійскія гульні, і гэта гадзіна ўсё бліжэйшая, — кажа **галоўны трэнер зборнай Беларусі па мастацкай гімнастыцы Ірына ЛЯПАРСКАЯ.** *— Наш этап дапаможа Кацярыне Галкінай і Анастасіі Салас (запаснымі будуць Аліна Гарнасько і Юлія Еўчык) праверыць свае сілы, убачыць, што выправіць, прыехаць на чэмпіянат свету ў Баку і завяваць ліцэнзіі ў Токіа».*

Найвышэйшы ўзровень спаборніцтваў будзе і ў групавых практыкаваннях, дзе канкурэнцыю двухразовым пераможцам II Еўрапейскіх гульняў беларускам паспрабуюць скласці каманды Расіі, Украіны, Італіі, Балгарыі, Азербайджана і Японіі.

Нагадаем, на мінулым дамашнім этапе Кубка свету зборная Беларусі заваявала сем узнагарод. Уваход на трыбуны Палаца мастацкай гімнастыкі вольны.

Нечакана, але прыемна

Чэмпіянат Еўропы па муай-тай пройдзе ў мінскім Палацы спорту з 4 да 11 лістапада

Адпаведны дагавор быў падпісаны старшынёй Беларускай федэрацыі кікбоксінга і тайландскага бокса, міністрам унутраных спраў Юрыем Караевым і віцэ-прэзідэнтам Еўрапейскай федэрацыі муай-тай Анатолем Сімончыкам.

Права прыняць наймацнейшых байцоў кантынента Мінск атрымаў нечакана, першапачаткова турнір павінен быў прайсці ў Іспаніі, але месца правядзення вырашылі змяніць. Нягледзячы на сціслыя тэрміны падрыхтоўкі да маштабнага спаборніцтва, Юрый Караеў адзначыў, што Мінск будзе гатовы прыняць турнір. «Мы вельмі сур'ёзна падыходзім да арганізацыі і лагістыкі. На

Тэніс для ўсіх

У Мінску стартуе аматарскі турнір Royal Cup Open

Серыя рэгулярных брэндавых турніраў Royal Cup Open стартуе сёння. Яго ўдзельнікі — гэта спартсмены-аматары. Спаборніцтва пройдзе ў фармаце мужчынскага і жаночага адзіночнага турніру. Змагацца за званне пераможцаў тэнісісты будуць на працягу двух тыдняў.

Турніры Royal Cup Open прызначаны для аматараў, а таксама былых прафесіяналаў рознага ўзроўню і катэгорый, як мужчын, так і жанчын. У турнірах вызначаны тры катэгорыі: Futures (тэнісісты пачатковага ўзроўню), Challenger (аматары сярэдняга ўзроўню) і Masters (гульцы высокага ўзроўню). Турніры праводзяцца ва ўсіх катэгорыях рэгулярна на працягу двух гадоў. У жніўні аматарскае спаборніцтва адбудзецца для мужчын і для жанчын у катэгорыі Challenger. Прыняць удзел у турнірах можа кожны ахвотны. «Развіццё і папулярызацыя тэніса, а таксама здаровага ладу жыцця, развіццё аматарскага тэніснага руху ў Беларусі, павышэнне ўзроўню спартыўнага майстэрства тэнісістаў-аматараў і майстроў, выяўленне наймацнейшых гульцоў, умацаванне сяброўскіх і дзелавых сувязяў паміж аматарамі тэніса — тыя мэты, якія мы як арганізатары ставім перад сабой, праводзячы кожны турнір. Брэндавыя турніры Royal Cup Open — гэта кваліфікаваныя суддзі, ветлівыя арганізатары, прыемныя падарункі і, вядома ж, невымоўныя адчуванні спартыўнай рызыкі і духу саперніцтва», — адзначыў **дырэктар брэндавых турніраў Royal Cup Open Ян ДРАНОЎСКІ.**

Спаборніцтвы праходзяць пры падтрымцы Міністэрства спорту і турызму, Мінскага гарадскога выканаўчага камітэта, Беларускай тэніснай федэрацыі. Анлайн-заяўкі на турніры можна пакінуць на афіцыйным сайце школы тэніса.

Напярэдадні падзеі

Вядомыя спартсмены і новыя дысцыпліны

Да чэмпіянату свету па летнім біятлоне застаецца тыдзень, атлеты і спарткомплекс «Раўбічы» завяршаюць сваю падрыхтоўку да буйнога турніру

Спаборніцтвы пройдуць у Беларусі з 23 да 25 жніўня, а днямі завяршылася заявачная кампанія. Заяўкі на чэмпіянат свету падалі 27 нацыянальных федэрацый біятлона, у турніры возьмуць удзел 116 жанчын і юніёрак, а таксама 141 мужчына і юніёр.

У гледачоў будзе магчымасць на свае вочы ўбачыць вядомых біятланістаў: Цімафея Лапшына, Ганну Фроліну, Андрэя Растаргуева, Кацярыну Глазырыну, Ларысу Кукліну, Красіміра Анева, Валянціну і Віту Семярэнка, Сяргея Сямёнава і многіх іншых. Чакаецца, што самымі прадстаўнічымі камандамі на чэмпіянаце стануць зборныя Чэхіі і Польшчы, наймацнейшы склад прывязе зборная Украіны, добрая каманда будзе і ад Расіі. Гонкі пройдуць як сярод дарослых спартсменаў, так і сярод юніёраў. У праграму сёлетняга чэмпіянату Міжнародны саюз біятланістаў уключыў новы від — суперспрынт. Ён яшчэ ніколі не праводзіўся на чэмпіянатах свету па летнім біятлоне — гэты фармат пакуль быў апрабаваны толькі на зімовых стартах. Акрамя суперспрынту, спартсмены выступяць у спрынтарскіх гонках і гонках праследавання. Мужчынскі спрынт будзе скарочаным, гэта значыць не звыклыя 10 км, а 7,5 км, меншай стане і гонка праследавання. Гэта сведчыць пра тое, што праграма чэмпіянату стала больш дынамічная і відовішчная.

Беларуская зборная выступіць на чэмпіянаце ў наймацнейшым складзе. У жаночых гонках на дыстанцыю выйдуць Ірына Крыўко, Дзінара Алімбекава, Ганна Сола, Ірына і Алена Кручынкіны. У мужчынскім турніры выступяць Раман Ялётнаў, Антон Смольскі, Сяргей Бачарнікаў, Максім Варабей і Віктар Крыўко. Цяпер наша нацыянальная каманда завяршае збор у Антхольцы і вернецца ў Мінск 21 жніўня. Трэнеры зборнай пра медальныя планы і задачы стараюцца не казаць, адзначаючы, што галоўныя старты ўсё ж такі будуць праходзіць падчас зімовага сезона і падрыхтоўка вядзецца менавіта да іх. Аднак не адмаўляюць, што беларусы ў Раўбічах будуць сярод лідараў.

Білеты для гледачоў на летні чэмпіянат свету ўжо даўно паступілі ў продаж, адны з іх з доступам на трасу, іншыя — з правам доступу на трыбуны: цэнтральную і бакавыя сектары.

Нагадаем, першы чэмпіянат свету па летнім біятлоне прайшоў у алімпійскім спартыўным комплексе пад Мінскам 20 гадоў таму. Праўда, тады спартсмены спаборнічалі ў кросе і стральбе, цяпер жа бег замяняюць гонкі на лыжаролерах. Самі «Раўбічы» за гэты час, вядома ж, таксама моцна змяніліся: пасля маштабнай рэканструкцыі ў 2015 годзе комплекс стаў універсальным і шматфункцыянальным. Высокую ацэнку за гэты час ён атрымліваў мноства разоў, апошні маштабны турнір прайшоў там зімой гэтага года. Падчас чэмпіянату Еўропы па біятлоне многія спартсмены і трэнеры адзначалі ўніверсальнасць і добрыя трасы спартыўнага комплексу. Да жнівеньскага турніру ў «Раўбічах» было праведзена маштабнае абслугоўванне мішэнных установак і інфармацыйнага табло. Дарэчы, мішэнямі займаюцца фінскія спецыялісты, якія будуць прысутнічаць і на самім чэмпіянаце. Да турніру ў «Раўбічах» абнавілі дарожкі, адзін з тэстаў на іх у мінулыя выхадныя правялі майстры лонгбордынга: падчас спаборніцтваў хуткасці спартсменаў-экстрэмалаў дасягаюць 60—65 км/г, а значыць, дарожкі павінны быць ідэальнай якасці. Перад турнірам спарткомплекс наведалі і тэхнічныя дэлегаты Міжнароднай федэрацыі біятлона, якія таксама ацанілі гатоўнасць «Раўбіч» да турніру.

Афіцыйны дзень заезду ўдзельнікаў чэмпіянату намечаны на 20 жніўня, але некаторыя каманды прыедуць у «Раўбічы» загадзя, каб правесці там яшчэ і трэніровачныя зборы.

Адзначым, што арганізацыя летняга чэмпіянату разам з чэмпіянатам Еўропы па біятлоне і Кубкам IBU была абавязковай умовай атрымання права на правядзенне этапу Кубка свету па біятлоне ў 2022 годзе.

РАСКЛАД СПАБОРНІЦТВАЎ:

23 жніўня (пятніца)

11:00 Суперспрынт. *Кваліфікацыя (юніёры)*
11:35 Суперспрынт. *Кваліфікацыя (юніёркі)*
13:20 Суперспрынт. *Кваліфікацыя (мужчыны)*
13:55 Суперспрынт. *Кваліфікацыя (жанчыны)*
15:30 Суперспрынт. *Фінал (юніёры)*
16:00 Суперспрынт. *Фінал (юніёркі)*
17:30 Суперспрынт. *Фінал (мужчыны)*
18:00 Суперспрынт. *Фінал (жанчыны)*

24 жніўня (субота)

10:45 Спрынт *(юніёры)*
13:15 Спрынт *(юніёркі)*
16:00 Спрынт *(мужчыны)*
18:00 Спрынт *(жанчыны)*

25 жніўня (нядзеля)

11:15 Гонка праследавання *(юніёры)*
13:15 Гонка праследавання *(юніёркі)*
15:45 Гонка праследавання *(мужчыны)*
17:30 Гонка праследавання *(жанчыны)*

Матэрыялы падрыхтавала Дар'я ЛАБАЖЭВІЧ.

ООО «СПЕЦРЕАЛИЗАЦИЯ»
ОБЪЯВЛЯЕТ О ПРОВЕДЕНИИ ПЕРВЫХ ОТКРЫТЫХ ТОРГОВ
в форме аукциона по продаже имущества ООО «КБСТ – управляющая компания холдинга «КБСТ-Холдинг» (УНП 690595242, Минская обл., Минский р-н, Боровлянский с/с, д. Королев Стан, ул. Московская, д. 17, комн. 205), находящегося в процедуре экономической несостоятельности (банкротства).

Дата и время проведения торгов: **17 сентября 2019 года**. Начало — 10.00, окончание — 12.00. Заявки принимаются с 17 августа 2019 года по 16 сентября 2019 года.

Место проведения торгов: г. Минск, просп. Победителей, 31-1, комната переговоров ОАО «Гостиница Планета».

Организатор торгов: ООО «СпецРеализация» (УНП 691842036, 223060, Минская обл., Минский р-н, Новодворский с/с, д. Большое Стиклево, д. 40, корп. 2, пом. 41), тел. 8(029) 684-71-76.

Продавец: ООО «КБСТ – управляющая компания холдинга «КБСТ-Холдинг» (УНП 690595242) в лице антикризисного управляющего Частного унитарного предприятия по оказанию услуг «Управление Право Бизнес». Тел. 8 (029) 6644589.

Шаг торгов – 5 %. Задаток – 5 %. Подробная информация об имуществе, условиях торгов и порядке проведения размещена на интернет-сайте http://bankrot.gov.by/. Контактный телефон +375296847176.

- в связи с утерей считать недействительным страховые свидетельства филиала СООО «Белкоопстрах» в г. Минске по добровольному страхованию от несчастных случаев и болезней на время поездки за границу форма 2РН, 2РП серия БМ № 1239304,1185802,1185803;

- в связи с утерей считать недействительным страховые свидетельства филиала СООО «Белкоопстрах» в г. Минске по договорам страхования, заключенным с физическим лицом (Форма 2РН), юридическим лицом или индивидуальным предпринимателем (Форма 2РП) по страхованию иному, чем страхование жизни формы 2РН, 2РП серия БК № 274546-274555 (всего 10 штук).

УНП 100706519

ЗАО «БЕЛРЕАЛИЗАЦИЯ»
ОБЪЯВЛЯЕТ АУКЦИОН

Организатор торгов: **ЗАО «Белреализация»** (УНП 191113330), 220089, г. Минск, ул. Уманская, 54, 4-й этаж паркинга, каб. 27, тел.: (8017) 298-53-53; (8029) 690 54 09, **BELTORGI.BY**.

Продавец: **частное предприятие «Агроэкоотдых»** (УНП 690547991) в лице антикризисного управляющего ООО «Капитал Диалог», тел. 8029 130-85-30.

Повторные публичные торги в электронной форме будут проведены: **3 сентября 2019 г**. с 9.00 до 17.00 на электронной торговой площадке BELTORGI.BY.

Предмет торгов – **Грузопассажирский пикап Toyota Tundra, 2008 г. в., цвет белый**. Начальная цена – 22 500,00 бел. руб. без НДС. Шаг торгов – 5 %, задаток – 10 % от начальной цены предмета торгов. Местонахождение предметов торгов – Минская обл., Узденский р-н, аг. Слобода, тел. для ознакомления и осмотра +37529 698 53 04.

Для участия в торгах необходимо в срок по 02.09.2019 г. до 17.00 1) зарегистрироваться и подать заявку по выбранному лоту на участие в торгах на сайте BELTORGI.BY; 2) перечислить задаток по выбранному лоту на р/с BY33BPSB30121854590139330000 в ОАО «БПС-Сбербанк», код BPSBBY2X, УНП 191113330, получатель – ЗАО «Белреализация».

Организатор торгов вправе отказаться от их проведения не позднее, чем за день до наступления даты проведения торгов. Торги проводятся при наличии не менее двух допущенных к участию в них участников. Победителем торгов признается лицо, предложившее наиболее высокую цену. Результаты торгов оформляются в виде протокола. Участнику, не выигравшему торги, задаток возвращается в течение 5 рабочих дней со дня проведения торгов. Победителю торгов задаток не возвращается и учитывается при окончательных расчетах по приобретению предмета торгов. Если заявка на участие в торгах подана только одним участником, торги признаются несостоявшимися. Предмет торгов продается претенденту на покупку при его согласии по начальной цене, увеличенной на пять процентов. Победитель торгов (претендент на покупку) обязан возместить сумму фактических затрат, связанных с организацией и проведением торгов, в течение 5 рабочих дней со дня их проведения, а также аукционный сбор. После этого между продавцом и победителем торгов в течение пяти дней со дня проведения торгов заключается договор купли-продажи. Извещение о ранее проведенных торгах опубликовано в газете «Звязда» от 08.06.2019 г.

ЗАО «БЕЛРЕАЛИЗАЦИЯ»
ОБЪЯВЛЯЕТ АУКЦИОН

Организатор торгов: **ЗАО «Белреализация»** (УНП 191113330), 220089, г. Минск, ул. Уманская, 54, 4-й этаж паркинга, каб. 27, тел. (8017) 298-53-53; (8029) 690 54 09, **BELTORGI.BY**.

Продавец: ООО «БелДрев» (УНП 500541442) в лице управляющего по делу о банкротстве ООО «Капитал Диалог», тел. +37529 130-85-30.

Повторные публичные торги в электронной форме в процедуре экономической несостоятельности (банкротства) (далее – торги) будут проведены: **3 сентября 2019 г**. с 9.00 до 17.00 на электронной торговой площадке **BELTORGI.BY.**

№ п/п	Наименование	Начальная цена, бел. руб. без НДС	Шаг торгов/задаток, бел. руб.
1	Грузовой седельный тягач Volvo TF 12 F рег. № АЕ 0662-4, 1989 г. в., г. Гродно, ул. Карского, 2а	2 624,40	131,22
2	Капитальное строение с инв. № 400/С-7159 (Склад культтоваров) общей площадью 982,8 кв. м, г. Гродно, Озерское шоссе, 186	170 586,00	8 529,30
3	Капитальное строение с инв. № 400/С-7157 (склад хозтоваров) общей площадью 1212,6 кв. м, г. Гродно, Озерское шоссе, 20	259 524,00	12 976,20
4	Капитальное строение с инв. № 400/С-7096 (склад) общей площадью 1396,3 кв. м, Котел стальной твердотопливный бытовой КСТБ-95 (инв. № 905), г. Гродно, Озерское шоссе, 20	253 254,60	12 662,73

Телефон для ознакомления и осмотра +37529 698-53-18.

Для участия в торгах необходимо в срок по 2 сентября 2019 г. до 17.00 1) зарегистрироваться и подать заявку по выбранному лоту на участие в торгах на сайте BELTORGI.BY; 2) перечислить задаток по выбранному лоту на р/с BY33BPSB30121854590139330000 в ОАО «БПС-Сбербанк», код BPSBBY2X, УНП 191113330, получатель – ЗАО «Белреализация».

Организатор торгов вправе отказаться от их проведения не позднее, чем за день до наступления даты проведения торгов. Торги проводятся при наличии не менее двух допущенных к участию в них участников. Победителем торгов признается лицо, предложившее наиболее высокую цену. Результаты торгов оформляются в виде протокола. Участнику, не выигравшему торги, задаток возвращается в течение 5 рабочих дней со дня проведения торгов. Победителю торгов задаток не возвращается и учитывается при окончательных расчетах по приобретению предмета торгов. Если заявка на участие в торгах подана только одним участником, торги признаются несостоявшимися. Предмет торгов продается претенденту на покупку при его согласии по начальной цене, увеличенной на пять процентов. Победитель торгов (претендент на покупку) обязан возместить сумму фактических затрат, связанных с организацией и проведением торгов, в течение 5 рабочих дней со дня их проведения, а также аукционный сбор. После этого между продавцом и победителем торгов в течение десяти рабочих дней со дня проведения торгов заключается договор купли-продажи. Извещение о ранее проведенных торгах опубликовано в газете «Звязда» от 09.07.2019 г.

Утерянные квитанции о приеме наличных денежных средств формы 1-СУ СВ2317376, страховой полис универсальный серии ПЕ0213917 страховой компании «Промтрансинвест» считать недействительными.

ИЗВЕЩЕНИЕ
О ПРОВЕДЕНИИ 19 СЕНТЯБРЯ 2019 ГОДА АУКЦИОННЫХ ТОРГОВ С УСЛОВИЯМИ ПО ПРОДАЖЕ ИМУЩЕСТВА, НАХОДЯЩЕГОСЯ В ОПЕРАТИВНОМ УПРАВЛЕНИИ УЧРЕЖДЕНИЯ «ГОМЕЛЬСКАЯ ЦЕНТРАЛЬНАЯ СПЕЦИАЛИЗИРОВАННАЯ ДЕТСКО-ЮНОШЕСКАЯ ШКОЛА ОЛИМПИЙСКОГО РЕЗЕРВА ПРОФСОЮЗОВ «СОЖ»

Сведения о предмете торгов (продаваемом имуществе)
«здание центральной гребной базы» с инвентарным номером 350/С-156880, площадью 1489,3 кв. м, расположенное на земельном участке с кадастровым номером 340100000007000144, площадью 0,2394 га по адресу: Гомельская обл., г. Гомель, ул. Перевалочная, 68
Начальная цена – 90 000,00 долларов США, с учетом НДС
Сумма задатка – 4 200,00 бел. руб.
Шаг аукциона – 15 %

Продавец имущества: учреждение «Гомельская центральная ЦСДЮШОР профсоюзов «Сож», ул. Советская, 29, 246050, г. Гомель, телефоны: +375 (232) 70-35-95, +375 (232) 70-19-93.

Организатор торгов: государственное предприятие «МГЦН», ул. К. Маркса, 39, к.10, 220030, г. Минск, телефон +375 (17) 327-48-36.

Условие торгов: Победитель торгов (покупатель) в течение 3 рабочих дней со дня проведения торгов оплачивает вознаграждение за организацию и проведение торгов, включающее затраты на организацию и проведение результативного аукциона, в белорусских рублях в размере, эквивалентном 2 процентам от наивысшей цены предмета торгов, указанной в протоколе о результатах торгов, по официальному курсу Национального банка Республики Беларусь на день проведения торгов.

Торги проводятся в соответствии со ст.ст. 417, 418 Гражданского кодекса Республики Беларусь и порядком проведения аукциона, утвержденным организатором торгов.

К участию в торгах допускаются юридические и физические лица, внесшие задаток и заключившие соглашение с организатором торгов о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона по соответствующему предмету торгов, а также представившие организатору торгов следующие документы:

заявление на участие в аукционе (по форме, установленной организатором торгов); заявление об ознакомлении с документами, продаваемым имуществом, порядком проведения аукциона (по форме, установленной организатором торгов); копию свидетельства о регистрации (для юридических лиц и индивидуальных предпринимателей); копию устава (для юридических лиц); копию платежного документа о внесении задатка; документы, подтверждающие полномочия представителя юридического (физического) лица; а также, при необходимости, иные документы в соответствии с порядком проведения аукциона.

Задаток перечисляется на расчетный счет государственного предприятия «МГЦН» № BY34 BPSB 3012 1049 7101 9933 0000 в Региональной дирекции № 700 по г. Минску и Минской области ОАО «БПС-Сбербанк», БИК BPSBBY2X, УНП 190398583, в срок, установленный для приема документов на участие в аукционе.

Торги проходят в форме открытого аукциона с условиями на повышение начальной цены. Торги проводит аукционист, определенный организатором торгов. В процессе торгов начальная цена повышается аукционистом до тех пор, пока только один участник согласится приобрести предмет торгов. Данный участник объявляется победителем торгов, а наивысшая цена (цена продажи) фиксируется в протоколе о результатах торгов и включает НДС. В ходе торгов участники могут предлагать свою цену за продаваемое имущество в соответствии с порядком проведения аукциона.

В случае если торги признаны несостоявшимися в силу того, что заявление на участие в них подано только одним участником или для участия в них явился только один участник, предмет торгов продается этому участнику (покупателю) при его согласии по начальной цене, увеличенной на пять процентов.

Стоимость продаваемого имущества, подлежащая оплате в белорусских рублях, определяется в размере, эквивалентном наивысшей цене в долларах США, указанной в протоколе о результатах торгов, по официальному курсу Национального банка Республики Беларусь на день перечисления денежных средств на счет продавца в соответствии с условиями договора купли-продажи предмета торгов, с учетом внесенной суммы задатка.

Договор купли-продажи между продавцом и победителем торгов (покупателем) подписывается после предъявления копии платежных документов о перечислении суммы вознаграждения за организацию и проведение торгов и заключается в течение 10 рабочих дней со дня проведения торгов.

Оплата стоимости приобретенного имущества с учетом НДС осуществляется победителем торгов (покупателем) в течение 30 рабочих дней со дня подписания договора купли-продажи.

Торги проводятся **19 сентября 2019 года в 11.00** по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, зал аукционов. Прием документов, а также консультации по вопросам участия в торгах осуществляются с 19.08.2019 по 17.09.2019 включительно в рабочие дни с 09.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 (по пятницам – до 16.45) по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. 6.

